

## УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

**АДЗІНСТВА. РАЗВІЦЦЁ. НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ.**

Усебеларускі народны сход (УНС) — агульны сход прадстаўнікоў народа, галін улады, кіраўнікоў і працаўнікоў прадпрыемстваў, дзеячаў навукі і культуры. Адна з важнейшых форм народаўладдзя.

**НА СХОД ВЫЛУЧАЮЦЦА ДЭЛЕГАТЫ З УСІХ РЭГІЁНАЎ КРАІНЫ.**

**АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ**

- ацэнка дзеянняў улады за мінулыя пяць гадоў
- вызначэнне асноўных напрамкаў і параметраў развіцця дзяржавы на маючую адбыцца пяцігодку
- выпрацоўка плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны

**МЕСЦА ПРАВЯДЗЕННЯ, ЗА ВЫКЛЮЧЭННЕМ ПЕРШАГА, — У ПАЛАЦЫ РЭСПУБЛІКІ Ў МІНСКУ РАЗ У ПЯЦЬ ГАДОЎ.**

- Першы УНС - 19-20 кастрычніка 1996 года, Палац спорту, **4740** дэлегатаў.
- Другі УНС - 18-19 мая 2001 года, **2500** дэлегатаў.
- Трэці УНС - 2-3 сакавіка 2006 года, больш за **2500** дэлегатаў.
- Чацвёрты УНС - 6-7 снежня 2010 года, **2500** дэлегатаў.
- Пяты УНС - 22-23 чэрвеня 2016 года, **2500** дэлегатаў.
- Шосты УНС - 11-12 лютага 2021 года, **2700** дэлегатаў*.

** Ад кожнай вобласці ва УНС прыме ўдзел не больш за 310 чалавек, ад Мінска - не больш як 370 грамадзян.*

Крыніцы: указ ад 28 снежня 2020 года № 492, vsebel.by. © Інфаграфіка БЕЛТА


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

11 ЛЮТАГА 2021 г. ЧАЦВЕР № 26 (29395)


# Сход, які вызначыць Шлях

Сёння ў Мінску распачынаецца VI Усебеларускі народны сход




Фота БелТА.

**ГЭТА ўжо можна назваць новай традыцыяй незалежнай Беларусі — кожныя пяць гадоў прадстаўнікі народа збіраюцца, каб разам з уладай вырашыць, якім шляхам ісці краіне далей. Як паказвае найноўшая гісторыя, менавіта гэтыя рашэнні становяцца вызначальнымі для далейшага развіцця Беларусі.**

**Сёлета за тым, што будзе адбывацца на гэтай народнай нарадзе, якія рашэнні будуць на ёй прымацца, жыхары краіны будуць сачыць з асаблівай увагай і чаканнем. На Сходзе павінна вырашыцца многае, што датычыцца не толькі будучыні нашай Беларусі, але і кожнага з нас.**

## КОРАТКА

- **ДАІ заклікала кіроўцаў не паркавацца надоўга на праезнай частцы.**
- СААЗ паведаміла аб зніжэнні колькасці тых, хто заразіўся каранавірусам, за тыдзень на 17 %.
- **БелАЗ паставіць 29 кар'ерных самазвалаў для адной з найбуйнейшых вугальных кампаній Расіі.**
- У Мінску больш за 80 % забруджвальных рэчываў паступаюць у атмасферу ад выхлапных газаў аўтатранспарту.


ISSN 1990 — 763X


На слыху

# ПЛАНАВЫ РЭЖЫМ, ВАКЦЫНАЦЫЯ І ПЛР-СЕРТЫФІКАТЫ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Як медыцынскія ўстановы Магілёўскай вобласці вяртаюцца да звычайнага рытму работы

**Пакуль еўрапейцы панікуюць вакол новага штама каварнага каранавіруса, у Беларусі адноснае зацішша. Колькасць зноў захварэлых пакрыху, але ж зніжаецца. А медыцынскія ўстановы вяртаюцца да свайго звыклага рэжыму. Адным з першых у Магілёўскай вобласці стаў абласны шпіталь ветэранаў, які яшчэ ў апошнія дні снежня правёў дэзынфекцыю сваіх памяшканняў і прыступіў да планавага прыёму пацыентаў.**

## У СТАНЕ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЦІ

Сёння шпіталь працуе ў звычайным рэжыме і пра ковід тут нішто не нагадвае. Хіба маскі на тварах і пальчаткі на руках медперсаналу.

— Нас яшчэ падчас першай хвалі каранавіруса задзейнічалі, а ў лістападзе зноў прыйшлося амаль на два месяцы стаць інфекцыйным стацыянарам, — адзначае **галоўны ўрач шпіталя Васіль АРЦЁМЕНКАЎ.** — Масачны рэжым мы захоўвалі і захоўваем, пастаянна апрацоўваем рукі. І кантралюем, каб гэта рабілі нашы пацыенты і тыя, хто да іх прыходзіць. Сёння ў нас занятыя пацыентамі 132 ложкі са 180. Гэта ўсё вельмі пажылыя людзі, і мы беражом іх. Двойчы на дзень кварцуем палаты, азануем памяшканні.

Васіль Рыгоравіч прызнаецца, што ковідны этап медустанова перанесла адносна лёгка. Медыкі хварэлі ў асноўным таму, што «падхапілі» вірус у так званых бытавых умовах — дома або ад знаёмых. Ад пацыентаў ніхто не заразіўся, бо прымяняліся ўсе меры аховы. Зараз таксама працуюць з асцярогай.

Магілёўскі філіял «Кардыялагічная бальніца», які разлічаны на 120 ложкаў, перайшоў на работу ў штатным рэжыме з другой паловы студзеня.

— Пад барацьбу з ковідам наша бальніца была задзейнічаная толькі падчас другой хвалі, — удакладняе **загадчык філіяла Уладзіслаў СТЭЛЬМАХАЎ.** — Наогул мы можам працаваць толькі ў адным рэжыме — або са звычайнымі пацыентамі, або з інфекцыйнымі. З улікам абстаноўкі, якая палепшылася і зніжэннем пнеўманій, перашлі ў свой звычайны рэжым. Цяпер у нас вядзецца ў асноўным планавая шпіталізацыя і аказваецца экстранная дапамога для хворых з парушэннямі рытму сэрца або крызамі. Калі ў чалавека тэмпература, ён накіроўваецца ў іншы стацыянар, дзе лечаць людзей са змешанай паталогіяй. Насцярожанасць між тым застаецца. Ковід можа працякаць некалькі дзён і бессімптомна. Калі ёсць падазрэнне, што чалавек хворы, адразу ж прымаюцца меры.


СТАР. 5

Сацыялогія

# Грамадская думка ўлічана

## Што паказалі вынікі сацыялагічнага апытання



**Учора былі агучаны вынікі рэспубліканскага апытання грамадскай думкі (пра тое, як праводзілася гэта сацапытанне, «Звязда» ўжо пісала ў мінулых нумарах). Апытанне праводзілася па заказе БелТА з 12 студзеня да 8 лютага Аналітычным цэнтрам EcooM з прыцягненнем фонду «Украінская палітыка» і ва ўзаемадзеянні з акрэдытаванымі ў Беларусі сацыялагічнымі цэнтрамі. З выкарыстаннем папяровых анкет і планшэтаў апытана 9896 рэспандэнтаў у 108 населеных пунктах усіх рэгіёнаў Беларусі з захаваннем прынцыпу рэпрэзентатыўнасці для насельніцтва Беларусі ад 18 гадоў па полу, узросце, узроўні адукацыі, тыпе населенага пункта і рэгіёне пражывання рэспандэнтаў. Статыстычная памылка выбаркі не перавышае 2,5 %.**

**Двухэтапнаму палявому даследаванню папярэднічала пілатажнае тэлефоннае апытанне, якое дазволіла падрыхтаваць неабходны інструментарый і выбудаваць тактыку збору першаснай сацыялагічнай інфармацыі.**

**На першым этапе праведзена тэрытарыяльнае апытанне эканамічна актыўнага насельніцтва, па выніках якога прынята рашэнне аб правядзенні другога этапу з больш шырокім ахопам розных катэгорый грамадзян. Акрамя арганізацыі запаўнення фармалізаваных анкет, перад інтэрв'юерам ставілася задача вывучэння запытаў і чаканняў грамадства, збору прапаноў насельніцтва па ўдасканаленні палітыкі дзяржавы ў розных сферах. Акцэнт рабіўся на адкрытых пытаннях, якія дазваляюць максімальна ўлічыць асабісты пункт гледжання рэспандэнтаў.**

**«Атрыманыя вынікі дазваляюць даць аб'ектыўную характарыстыку грамадскай думкі жыхароў Беларусі», — падкрэсліў Сяргей МУСІЕНКА, кіраўнік Аналітычнага цэнтра EcooM, які абнародаваў учора вынікі апытання.**

**Згодна з імі...**

### *Прэзідэнту Беларусі давяраюць 66,5 % жыхароў краіны*

«Узровень даверу Прэзідэнту па гэтым вялікім апытанні склаў 66,5 %. У тэлефонным апытанні, якое папярэднічала гэтаму даследаванню, было 74,2 %, — адзначыў Сяргей Мусіенка. — Найбольшы ўзровень даверу арміі — 69,2 %, царкве — 66,8 %, ураду — 57 %, праваахоўным органам — 51,9 %». Па словах Сяргея Мусіенкі, як правіла, пасля вялікай палітычнай кампаніі гэтыя лічбы зніжаюцца.

У той жа час беларускай апазіцыі ў цэлым не давярае 63,4 % рэспандэнтаў, давярае 17,2 %. «Калі задаюцца адкрытыя пытанні — «Назавіце лідара апазіцыі», — практычна адзінкі называлі людзей са старой кагорты апазіцыі. Гэтыя 20-25 гадоў іх барацьбы з «рэжымам» выліліся ў тое, што з 10 тысяч адказаў 3-4 чалавекі называюць таго, каго лічаць пастаянным ньюсмейкерам. Прыйшлі новыя людзі — іх называюць і часта блытаюцца», — звярнуў увагу сацыёлаг.

### *Пратэсныя акцыі ў краіне не падтрымліваюць 72,4 % беларусаў*

«Большасць апытаных — 72,4 % — не падтрымліваюць акцыі пратэсту, якія адбываюцца ў краіне, а аб падтрымцы пратэсных акцый выказалася 15,4 % апытаных, — сказаў Сяргей Мусіенка. — Акрамя таго, 75,9 % адказала, што акцыі пратэсту аказваюць негатыўнае ўздзеянне на якасць жыцця насельніцтва, што ў прынцыпе аб'ектыўна і зразумела, бо людзі ўжо ў выхадныя восенню асабліва стараліся ні дзяцей у секцыі не вадзіць, ні самі нікуды не выходзіць адпачыць. У вялікіх гарадах — па меншай меры, Мінску — гэта, вядома, адчувалася».

### *Зніжэнне дабрабыту з дзейнасцю ўрада звязваюць толькі 6,5 % апытаных*

«Большасць рэспандэнтаў — 64,9 % — лічаць, што эканамічная сітуацыя ў краіне пагоршылася. Пагаршэнне ўласнага матэрыяльнага становішча канстатавала 50,6 % апытаных, 29,2 % паказала, што іх матэрыяльнае становішча не змянілася. 16,9 % адказала, што ў гэтым вінаватыя самі грамадзяне. Зніжэнне дабрабыту з дзейнасцю ўрада звязваюць толькі 6,5 % апытаных, з дзейнасцю Прэзідэнта — 4,5 %», — сказаў Сяргей Мусіенка. Пры гэтым ён адзначыў, што пагаршэнне эканамічнай сітуацыі — гэта агульнасусветная тэндэнцыя, звязаная з пандэміяй.

У выпадку пагаршэння эканамічнай сітуацыі 63,5 % рэспандэнтаў маюць намер самастойна шукаць іншы шлях паляпшэння жыцця. «І толькі 6 % паказалі, што, апынуўшыся ў такой сітуацыі, далучацца да арганізацый, якія дамагаюцца змены ўлады ў краіне рознымі шляхамі», — адзначыў дырэктар EcooM.







# НА СХОД — ЯК НА СВЯТА




Фота БелТА.

**З рэгіёнаў краіны дэлегаты сходу выправіліся ў шлях ужо ўчора. Фотакарэспандэнты БелТА паназіралі, як гэта было. Настрой ва ўсіх — і гэта відаць на здымках — урачыста-святочны.**










# Прапановы на ўзроўні Асноўнага Закона

**Дзяніс ДУК узначальвае вядучую ВНУ вобласці па падрыхтоўцы педагагічных кадраў — Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова. Ён — адзін з аўтарытэтных археолагаў Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар, уладальнік медаля Францыска Скарыны. Вучоны развівае навуку, вядзе актыўную грамадскую дзейнасць, каардынуе выхаваўчы працэс. На сходзе ён будзе прадстаўляць не толькі свой універсітэт, а і ўсіх тых ініцыятыўных людзей рэгіёна, якія выказаліся за ўдасканаленне Канстытуцыі — асноўнага беларускага закона.**



Дэлегат з'яўляецца адным з каардынатараў пляцоўкі па пытаннях канстытуцыйнага рэфармавання і партыйнага будаўніцтва. Адкрыты дыялог, дзе абмяркоўваліся главы і раздзелы Асноўнага Закона Беларусі, адбыўся на базе ўніверсітэта імя Куляшова. У дыялогу ўзялі ўдзел прадстаўнікі судовай і пракурорскай сістэмы, юстыцыі, палітычных партый і арганізацый, вучоныя ўніверсітэтаў вобласці, жыхары рэгіёна. Яны шмат гаварылі пра неабходнасць удасканалення беларускай прававой сістэмы. Іх прапановы былі зацверджаны ў рэзалюцыі Магілёўскага аблвыканкама.

— Ад Усебеларускага народнага сходу я чакаю, што будуць прыняты прынцыповыя для рэфармавання нашага Асноўнага Закона змяненні, — адзначыў Дзяніс Дук. — Мы вынеслі некалькі прапаноў і чакаем, што пасля шырокага абмеркавання яны будуць вынесены на ўсенародны рэферэндум. Гэта, напрыклад, стварэнне інстытута ўпаўнаважанага па правах чалавека, удасканаленне выбарчай сістэмы, змена механізмаў фарміравання цэнтральнай камісіі па выбарах, мараторый на прымяненне смяротнага пакарання і іншыя падыходы, у тым ліку замацаванне статусу Усебеларускага народнага сходу. Спадзяюся, што наша работа не прайшла марна і тыя прапановы, якія мы вынеслі, будуць пачуты.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Варта забяспечваць стабільнасць

**Старшыня Мінскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза хімічнай, горнай і нафтавай галін прамысловасці Дзмітрый ШВАЙБА нарадзіўся ў невялікім шахцёрскім гарадку на Урале. Пераехаў у Беларусь, якая стала для яго другой радзімай. Займаецца навуковай работай. Яго абралі дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Аб тым, што хацеў бы агучыць з трыбуны форуму, ён расказаў «Звяздзе».**

— Сёння трэба гаварыць пра работу рэальнага сектара эканомікі, які можа забяспечваць сацыяльна-эканамічны прагрэс, — лічыць Дзмітрый Швайба. — Любы чалавек успрымае сваё існаванне праз асабісты эканамічны дабрабыт. У яго простыя пасыл, патрабаванне да дзяржавы, каб жыццё пастаянна хоць крыху паляпшалася. І зразумела, калі матэрыяльнае становішча ўмацоўваецца, ён зможа пашырыць свой індывідуальны спажывецкі кошык. А гэта азначае працяг эканамічных дасягненняў краіны. Таму, канешне, іду на Усебеларускі народны сход з чаканнем, што там будзе агучана праграма развіцця нашай краіны на будучую пяцігодку. Натуральна, што мы павінны ставіць задачы ўстойлівага развіцця і варыянты іх рашэння. Проста іншага не дадзена. Наша краіна ў найбліжэйшай перспектыве павінна развівацца ўстойліва. І адсюль мы атрымаем падмурак грамадства і грамадзянскай згоды ў краіне.

На прадпрыемствах, дзе створаны нашы прафсаюзныя арганізацыі, у людзей ёсць магчымасць працаваць, зарабляць, павышаць сваю кваліфікацыю, развівацца. І ў гэтых суб'ектаў гаспадарання ёсць перспектыва. І не толькі ў іх, паколькі апошнія ствараюць вялікую колькасць рабочых месцаў вакол сваёй сферы. Але такіх пунктаў росту павінна быць больш, што, канешне, задача дзяржавы. І найперш, наколькі я разумею, у невялікіх населеных пунктах. Гэта, на мой погляд, адно з ключавых пытанняў праграмы. Свет імкліва мяняецца, і не работа мігрыруе за чалавекам, а, наадварот, чалавек едзе па работу. Павелічэнне колькасці рабочых месцаў у невялікіх пасёлках — гэта забеспячэнне сацыяльнай інфраструктуры: дарогі, дзіцячыя садкі, паліклінікі. І мы павінны дакладна ўсведамляць, што павінны зрабіць тое адназначна. На мой погляд, трэба вельмі сур'ёзна перагледзець канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Ёсць паняцці эканамічнай і сацыяльнай бяспекі. І яны былі



раздзелены на заканадаўчым узроўні, аднак іх неабходна не толькі зблізіць, але і аб'яднаць з тым, каб выйсці на разуменне сацыяльна-эканамічнай бяспекі. У новым інфармацыйным полі паскорыўся абмен інфармацыяй, ён стаў больш просты і даступны. У кожнага ў кішэні, так бы мовіць, «Вялікая савецкая энцыклапедыя» — айфоны, смартфоны. Таму нам нельга быць няшчырымі ў адносінах да людзей, разлічваць на недастатковую іх інфармаванасць. Нам варта падыходзіць да кожнага з адкрытым сэрцам, зразумелым тлумачэннем. І тады цябе пачуюць, табе павераць. Разам з тым у кожнага ёсць магчымасць праверыць звесткі. Таму неабходнасць аб'яднання сацыяльнай і эканамічнай бяспекі відавочная. Гэта не значыць, што трэба рашыць пытанне менавіта цяпер. Але неабходна набліжацца да таго, каб зрабіць гэта на нацыянальным узроўні, а затым у дадзенай частцы «падцягваць» рэгіянальную палітыку.

Я ўдзельнічаў у некалькіх дыялогавых пляцоўках, ведаю пажаданні людзей. І бачу, што цікавасць да іх выказванняў, прапаноў ёсць у дзяржаўнага апарату, Саветаў дэпутатаў, дэпутацкага корпуса нацыянальнага ўзроўню. Усё варта глыбока асэнсаваць і прыняць разумныя рашэнні. Ад гэтага залежыць будучыня беларускай дзяржавы.

Кожнае рабочае месца павінна быць эфектыўнае. Мы ад гэтага не адыдзем ва ўмовах глабальных канкурэнцыі і рынку рабочых месцаў. Калі хочам мець высокапрафесійнага спецыяліста, неабходна прапанаваць яму тую заработную плату, якая адпавядае яго чаканням, а таксама забяспечваць рост тэхналагічнага ўзроўню рабочага месца. Сёння вельмі многім абсталяваннем, якое ўкараняецца ў нашай галіне, трэба кіраваць, умоўна кажучы, як верталётам. Спецыяліста такога ўзроўню трэба рыхтаваць пяць, сем гадоў пасля заканчэння ім навучальнай установы. Хаос на рынку працы дорага абыходзіцца прадпрыемству, рэгіёну і краіне ў цэлым. Стабільнасць развіцця варта забяспечваць для кожнага суб'екта гаспадарання.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# За моцную і квітнеючую вёску



**Мікалай ДАРЭЧКІН працуе ў СВК «Радзіма», што ў Бялыніцкім раёне, механізатарам больш чым 30 гадоў — з таго самага моманту, як толькі вярнуўся з арміі. А дапамагаць маці і старэйшым братам бегаў у калгас яшчэ школьнікам. Тады, напэўна, ён падсвядома і зрабіў свой выбар. А калі пачаў працаваць, зразумеў, што не памыліўся.**

— Уяўляеце, мне адразу ж даверылі новы трактар, — згадвае ён свае першыя дні работы ў калгасе. — Гэта была вельмі вялікая адказнасць. Цяпер тэхніка не тое, што раней, яна стала больш камфортная і разумная. Раней зімой у салоне замярзалі, а цяпер цёпла. Ды і ўмовы работы ў гаспадарцы сталі на парадак вышэйшыя. Не параўнаць з тым, што было.

Мікалай вельмі хварэе душой за справу і будзе на Усебеларускім народным сходзе прадстаўляць сваю гаспадарку, якую лічыць узорнай. Моладзь ахвотна ідзе ў яе працаваць.

— У нас 150 адзінак тэхнікі, у тым ліку вядучых сусветных вытворцаў, — кажа ён.— Адных толькі інжынераў, якія яе абслугоўваюць, чацвёра. І ўсім да 30 гадоў. Галоўны інжынер таксама хоць і малады, але добра спраўляецца са сваімі абавязкамі. Такія людзі вельмі патрэбныя сельскай гаспадарцы. Пасля Беларускай сельгасакадэміі прыехала да нас працаваць маладая пара, а ўжо у нас пабраліся шлюбам. Ім адразу ж кватэру выдзелілі і матэрыяльную дапамогу. Калі пяць гадоў адпрацуюць, вяртаць грошы не прыйдзецца. У гаспадарцы для маладых наогул існуе шэраг розных дабавак да зарплаты. Яны бачаць, што тут можна зарабіць нядрэнныя грошы, і застаюцца. Шмат моладзі не толькі сярод спецыялістаў, але і сярод механізатараў, жывёлаводаў. Калі ў чалавека душа ляжыць да сельскай гаспадаркі, ён у горад ірвацца не будзе. На жаль, сёння не ўсюды так добра, як у нашым калгасе.

Летась па краіне аграрыі прадэманстравалі высокія вынікі — сабралі больш чым 10 мільёнаў тон ураджаю, прыбавіла ў вазе жывёла, падраслі надоі. Але патэнцыял яшчэ ёсць, лічыць суразмоўнік.

— На жаль, працэс тармозяць слабыя гаспадаркі, якія нікуды не імкнуцца, — перажывае ён. — А калі б яны напружыліся, можна было б дасягнуць і больш значных вынікаў. Хацелася б, каб гэтыя гаспадаркі таксама падцягнуліся.

Пад адказнасцю Мікалая Дарэчкіна ў калгасе тры адзінкі тэхнікі — трактар, кормаўборачны і зернеўборачны камбайны. І ніхто без яго дазволу на іх не садзіцца. Такая палітыка гаспадаркі. Калі ў тэхнікі адзін гаспадар, яна працуе лепш і заўсёды дагледжаная. Без гэтага не дасягнеш высокіх вынікаў у рабоце.

— Я рамантую сваю тэхніку не больш за два тыдні, бо не ў маіх інтарэсах расцягваць гэтае задавальненне, — усміхаецца суразмоўнік. — У гаспадарцы менавіта такі перыяд адведзены для рамонту і аплачваецца дастойна. Хто што б ні казаў, а стымуляцыя рублём усё ж такі адыгрывае вялікую ролю. Падчас пасяўной і ўборкі нас заўсёды запрашаюць на сход і ставяць задачы, агучваюць, колькі мы можам зарабіць і якія прэміі атрымаць. Вельмі важна, каб зарплата была менавіта заробленая. Старшыня нашага калгаса Аляксандр Лапацентаў аднойчы трапна заўважыў: сёння кожны працуе не на Лапацентава, а на сябе. І гэта праўда. Ніхто з нас не цягне ўсе жылы, дастаткова працаваць проста добрасумленна.

У нас гэта сістэма добра наладжана. І кіраўнік пастаянны. А ў некаторых калгасах работнікі нават прозвішча свайго старшыні не паспяваюць запомніць, бо тыя мяняюцца адзін за адным. Знаёмы калгаснік расказваў, што пакуль ім мянялі кіраўнікоў, людзі разбегліся. Наш строгі, але справядлівы. Летам, напрыклад, тэхніка павінна быць у полі ўжо ў 7 гадзін раніцы. І ўсе дакладна гэта ўсведамляюць. Як і тое, што без нашай гаспадаркі вёска была б у заняпадзе. Сёння тут ёсць усе ўмовы для работы і адпачынку. Нядзіўна, што ў Вішоў людзі едуць і застаюцца.

Мінулы год быў асабліва цяжкі, пакуль у горадзе ўсе, хто мог, пераводзіліся на дыстанцыйную работу, гаспадаркі працягвалі працаваць у палях. Здавалася, што каранавірус іх нават не чапае. Але калгаснікі таксама хварэлі. Тым не менш гэта не перашкодзіла ім выйсці на перадавыя пазіцыі.

— Я сам у пачатку чэрвеня перахварэў, — прызнаецца Мікалай. — Цэлы месяц лячыўся. Але потым нагнаў, намалаціў каля 7 тысяч збожжавых, зернебабовых і кукурузы. Можна было б зрабіць і больш, але дажджы перашкодзілі.

На Усебеларускі народны сход Мікалай Дарэчкін едзе з вялікімі спадзяваннямі. Хоць і прызнаецца, што яму працей знаходзіцца на сваім рабочым месцы, чым выступаць перад вялікай аўдыторыяй. Але цяпер ён адчувае, што не мае права маўчаць.

— Хачу сказаць дзякуй Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку, — кажа Мікалай. — Яшчэ ў пачатку незалежнасці нашай краіны ён зрабіў стаўку на развіты аграрны сектар. Колькі важных і патрэбных праектаў па развіцці вёскі рэалізавана па яго ініцыятыве. Дзякуй яму за тое, што ён дазволіў нам застацца ў якасці СВК і не перабудоўваць сістэму работы. Яго словы на прыкладзе нашай гаспадаркі рэалізаваліся літаральна. Ён раіў пакласці ў аснову прынцып: выдатная работа — выдатныя вынікі — высокі даход гаспадаркі — высокая зарплата. Наш калектыў неаднаразова займаў прызавыя месцы ў рэспубліканскіх спаборніцтвах, тройчы гаспадарцы аб'яўлялася Падзяка Прэзідэнта. І зарплата ў нас — іншым на зайздрасць. Асабіста ў мяне, звычайнага механізатара, сярэдняя за мінулы год склала больш чым 2,5 тысячы рублёў. Наш кіраўнік Аляксандр Лапацентаў ніколі не забывае пра тое, што за высокімі вынікамі стаіць менавіта чалавек. Мы рыхтуем кадры яшчэ са школьнай парты, калгас плаціць выдатнікам вучобы стыпендыі, умацоўвае матэрыяльна-тэхнічную базу школы. Я люблю сваю работу, сваю вёску, сваю сям'ю. У кожнага свая мера шчасця, але ёсць і агульнае — гэта мір і спакой. Сельскія працаўнікі падтрымліваюць міралюбівую і сацыяльна накіраваную палітыку дзяржавы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Кампетэнтна

# У АСНОВЕ ДЗЯРЖПРАГРАМЫ — КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

**Каб стварыць умовы для эфектыўнай работы сферы культуры і актыўна далучаць беларусаў да культурнага жыцця краіны, прынята новая дзяржпраграма «Культура Беларусі» на 2021—2025 гады. На што будзе зроблена стаўка ў гэтай сферы ў найбліжэйшае пяцігоддзе, расказаў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**


Фота БелТА.

## ДЛЯ СПІСАЎ ЮНЕСКА ПАДРЫХТУЮЦЬ ПЯЦЬ НОВЫХ ДАСЬЕ

Праграма складаецца з пяці падпраграм: «Культурная спадчына», «Мастацтва і творчасць», «Функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры», «Беларусы ў свеце», «Архівы Беларусі».

Так, мерапрыемствы падпраграмы «Культурная спадчына» дапамогуць захаваць і эфектыўна выкарыстоўваць гісторыка-культурныя каштоўнасці, павялічыць наведвальнасць музеяў і бібліятэк шляхам пашырэння доступу розных катэгорый насельніцтва да якасных і разнастайных паслуг гэтых устаноў, стварыць умовы для далейшага развіцця культур нацыянальных меншасцяў.

«У прыватнасці, запланавана ўвядзенне ў эксплуатацыю 28 помнікаў архітэктуры, якія раней не выкарыстоўваліся, уключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі 20 новых нематэрыяльных каштоўнасцяў, распрацоўка і прадстаўленне ў арганізацыі ЮНЕСКА пяці дасье на аб'екты спадчыны і нематэрыяльныя праяўленні творчасці», — расказаў Ігар Петрышэнка.

Падпраграма «Мастацтва і творчасць» дазволіць палепшыць умовы для развіцця мастацкай творчасці (прафесійнай і аматарскай), народных мастацкіх промыслаў (рамёстваў), дасягнуць высокіх мастацкіх вынікаў і эканамічнай канкурэнтаздольнасці ў галіне прафесійнага мастацтва. Чакаецца, што на кінаэкранах і тэлеканалах краіны стане больш беларускай кінапрадукцыі, будуць створаны ўмовы для рэалізацыі творчага патэнцыялу розных катэгорый насельніцтва. Па словах Ігара Петрышэнкі, урад таксама зацікаўлены ў папулярызацыі дасягненняў беларускай мастацкай творчасці ў краіне і за мяжой.

Тэатральна-відовішчныя арганізацыі будуць праводзіць у год не менш за 13,5 тысячы спектакляў, канцэртаў, прадстаўленняў. У 2021—2025 гадах арганізуюць 34 мерапрыемствы па міжнародным культурным супрацоўніцтве. Сярод іх — дні нацыянальных культур, дні кіно, міжнародныя форумы, выстаўкі, кірмашы. Даходы ад кінапаказу і іншых паслуг кінапракатных і кінавідовішчных арганізацый ацэньваюцца ў Br40,7 млн.

## УСЕ КІНАТЭАТРЫ АЛІЧБУЮЦЬ

Падпраграма «Функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры» дасць магчымасць павысіць сацыяльную і эканамічную эфектыўнасць работы аб'ектаў інфраструктуры ў культурнай сферы, мадэрнізаваць кінатэатры, абнавіць матэрыяльна-тэхнічную базу, у тым ліку фонды музычных інструментаў, паскорыць фарміраванне нацыянальнага лічбавага культурнага кантэнту і яго інтэграцыю ў сусветную інфармацыйную прастору. «Запланаваны будаўніцтва, рэканструкцыя, рэстаўрацыя, капітальны рамонт або мадэрнізацыя 124 аб'ектаў культуры. Да канца 2025 года ўсе кіназалы ў кінатэатрах будуць аснашчаны лічбавым кінаабсталяваннем», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Згодна з падпраграмай «Беларусы ў свеце» будуць зроблены крокі ў распаўсюджванні і папулярызацыі беларускай культуры, гісторыі і мовы ў свеце, захаванні нацыянальнай самаідэнтычнасці беларусаў замежжа, духоўных каштоўнасцяў і культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа. Акрамя таго, будуць забяспечаны дыялог дзяржавы з беларускай дыяспарай, доступ суайчыннікаў да аб'ектыўнай інфармацыі пра падзеі ў Беларусі, умацаванне супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай на прынцыпах узаемнай павагі і даверу.

Вынікам рэалізацыі падпраграмы «Архівы Беларусі» стануць эфектыўнае фарміраванне Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі, стварэнне ўмоў для захаванасці архіўных дакументаў, прыцягнення ўвагі грамадскасці да архіўнай інфармацыі.

Працягнуць удасканальваць і прававое рэгуляванне ў сферы культуры. Галоўнай задачай стане карэкцыроўка Кодэкса аб культуры.

**Паводле БелТА.**

Тэхналогіі

# Велапаркоўка з... сонечнымі панэлямі

## Яны з'явяцца ў рамках праекта «Зялёныя гарады»

**У дадатак да ўжо ўстаноўленых 25 традыцыйных велапарковак у Полацку ўпершыню з'явяцца пяць велапарковак, аснашчаных сонечнымі панэлямі, паведамілі ў Міністэрстве прыроды і аховы навакольнага асяроддзя.**

Велапаркоўкі з сонечнымі панэлямі ўстановяць на аглядальнай пляцоўцы ў раёне Сафійскага сабора па вуліцы Ніжне-Пакроўскай, каля помніка Усяславу Чарадзею на скрыжаванні вуліц Кастрычніцкай і Ефрасінні Полацкай; у скверы насупраць будынка «Белдзяржстраха» ў раёне гармат, у скверы па праспекце Ф. Скарыны каля капліцы загінулым у афганскай вайне; побач са спартыўным клубам «Фенікс» па вуліцы Багдановіча, 3. Працэс устаноўкі зойме каля месяца, крайні тэрмін — 15 сакавіка.



Спецыялісты па сучасным гарадскім развіцці ўсё часцей звяртаюцца да аднаўляльных крыніц энергіі. Прыкладамі, узорамі для пераймання становяцца гарады, якія шукаюць недарагія, экалагічныя і надзейныя крыніцы энергіі, выбіраюць шлях разумнага і зялёнага развіцця. Полацк — у іх ліку. Тут разглядаюць аднаўляльныя крыніцы энергіі як неад'емную частку гарадскіх стратэгій.

Сонечная панэль — гэта бясплатная і невычэрпная крыніца энергіі, а таксама адсутнасць экалагічнай шкоды для навакольнага асяроддзя. Дзякуючы іх выкарыстанню на новых велапаркоўках можна будзе зарадзіць мабільны тэлефон, планшэт, партатыўны камп'ютар. Канструкцыя такой велапаркоўкі мае лаканічны, стыльны вонкавы выгляд. Яны арганічна ўпішуцца ў гарадское асяроддзе.

На сённяшні дзень агульная працягласць веладарожак у Полацку складае 15 кіламетраў, з якіх 6,5 кіламетра пабудавана па праекце «Зялёныя гарады».

Праект фінансуецца Глабальным эканамічным фондам і выконваецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Мэта — больш шырокае развіццё планаў зялёнага горадабудаўніцтва і рэалізацыя пілотных ініцыятыў, звязаных з павышэннем энергаэфектыўнасці і ўстойлівым транспартам у малых і сярэдніх гарадах Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Сугучча

# АЛІШЭРУ НАВАІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Урачыстым ускладаннем кветак ад узбекскага пасольства ў Беларусі, прадстаўнікоў узбекскай дыяспары і беларускай творчай інтэлігенцыі да помніка класіку ўзбекскай нацыянальнай літаратуры, легендарнаму асветніку адзначылі 580-годдзе з дня яго нараджэння.**

— Мы рады, што і ў Мінску, лічы, у цэнтры горада, ёсць магчымасць сустрэцца з нашай культурай, з помнікам Алішэру Наваі як роднаму творцу і для Узбекістана, і для ўсяго свету, — гаворыць **саветнік узбекскага пасольства Даніяр АБІДАЎ.** — Дзякуй, што поруч з афіцыйнымі асобамі, прадстаўнікамі МЗС Рэспублікі Беларусь і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прыйшлі і пісьменнікі, узбекская моладзь, якая вучыцца ў Мінску.

Свае пераклады твораў А. Наваі на гэтым імправізаваным мітынгу прачытаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, паэт Мікола Мятліцкі. А ўзбекская студэнтка, будучы ўрач-стаматолаг Мухабатон Абдулажанава гаварыла з прысутнымі на роднай мове Наваі, дэкламуючы адзін з яго класічных твораў.

Юбілей Алішэра Наваі пераўтварыўся ў Мінску ў шырокую культурную, асветніцкую праграму. Выйшла кніга ўзбекскага класіка на беларускай мове — «Улюбёны сэрцаў». З'явіліся публікацыі ў розных беларускіх медыя. А днямі пройдзе і навукова-практычная канферэнцыя ў гонар паэта, удзел у якой возьмуць і навукоўцы, пісьменнікі з Узбекістана.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Лівіі з'явіўся новы ўрад нацыянальнай згоды



Галоўныя бакі ўзброенага канфлікту ў Лівіі абралі ў Жэневе на арганізаваным пры пасрэдніцтве ААН форуме новы пераходны ўрад нацыянальнага адзінства (GNA). Ён будзе ўзначальваць Лівію да правядзення агульнанацыянальных выбараў, прызначаных на 24 снежня. Прэм'ер-міністрам Лівіі абраны бізнесмен Абдул Хамід Дбейба. Ён будзе працаваць разам з былым паслом Лівіі ў Грэцыі Мухамедам Юнісам Менфі, які ўзначаліць прэзідэнцкі савет. Абранне Дбейбы стала вялікім сюрпрызам, таму што ён абышоў некалькіх палітычных цяжкавагавікоў. Дбейба — сваяк Алі Дабайбы, аднаго з самых багатых лівійцаў, які працаваў ва ўрадзе Кадафі, а пасля яго звяржэння абвінавачваўся ў раскраданні грамадскіх сродкаў.

## Эксперты СААЗ выключылі версію аб лабараторным паходжанні COVID-19



Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) па выніках паездкі ў Кітай прыйшлі да высновы, што лабараторнае паходжанне каранавіруса SARS-CoV-2 «вельмі малаверагоднае», паведаміла агенцтва Bloomberg. Эксперты арганізацыі ўпэўнены, што тэорыя пра ўцечку віруса з лабараторыі не патрабуе далейшых праверак. Даныя даследаванняў паказваюць, што першапачаткова каранавірус цыркуляваў сярод кажаноў, але малаверагодна, што гэтыя жывёлы сталі прычынай успышкі ва Ухані, адзначыў кіраўнік місіі СААЗ ва Ухані Пітэр Бэн Эмбарэк. Ён адзначыў, што, хутчэй за ўсё, вірус перадаўся чалавеку не непасрэдна ад жывёл, а праз прамежкавага носьбіта. Аднак гэтая гіпотэза патрабуе дадатковых даследаванняў, адзначыў эксперт. Аб лабараторным паходжанні каранавіруса раней заяўлялі чыноўнікі колішняй адміністрацыі ЗША. Кітайскае МЗС называла гэтую версію бяздоказнай.

## Першы арабскі касмічны апарат паспяхова выйшаў на арбіту Марса




Аўтаматычная міжпланетная станцыя Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Al Amal («Надзея»), пераадолеўшы амаль 500 мільёнаў кіламетраў, паспяхова выйшла на арбіту Марса. Аб гэтым паведаміла касмічнае агенцтва краіны. Запуск станцыі быў ажыццёўлены 20 ліпеня з дапамогай японскай ракеты-носьбіта з касмічнага цэнтра Танэгасіма. Апарат, які будзе знаходзіцца на эліптычнай арбіце Марса вышынёй 40 тысяч кіламетраў, прызначаны для вывучэння клімату і ніжніх слаёў атмасферы планеты, дзе фарміруецца яе надвор'е. Станцыя абсталяваная трыма камерамі, якія дазваляюць весці назіранне за атмасферай Марса ў бачным, інфрачырвоным і ультрафіялетавым дыяпазонах. Місія працягнецца каля двух гадоў. Эміраты сталі пятай краінай у свеце, чый апарат дасягнуў Марса.

# ПРАЙШЛІ ВЫПРАБАВАННЕ

## Студэнтаў Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта адзначылі за працу ва ўмовах пандэміі каранавіруса

**Звыш 40 студэнтаў атрымалі ганаровыя ўзнагароды, якія ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаны ад міністра аховы здароўя, галоўнага ўпраўлення аховы здароўя аблвыканкама, галіновага прафсаюза і медуніверсітэта. А ўсяго ў барацьбе з каранавіруснай інфекцыяй у краіне задзейнічана больш за 2,5 тысячы студэнтаў-медыкаў.**



Ва ўстановах аховы здароўя Гродзеншчыны падчас другой хвалі каранавіруса працавала звыш 300 гродзенскіх студэнтаў-медыкаў. Яны былі задзейнічаны ў якасці валанцёраў, сярэдняга медперсаналу, работнікаў выязных брыгад хуткай дапамогі, супрацоўнікаў кол-цэнтра.

Студэнт-шасцікурснік Марцін Кудраўцаў быў сярод тых, хто першы ў Гродне сустрэўся з пацыентам з небяспечнай інфекцыяй. Памятае, як з жахам пачалі гаварыць у горадзе пра першы зарэгістраваны выпадак захворвання. Пасля таго як быў пацверджаны дыягназ, ён з брыгадай хуткай дапамогі аб'язджаў усіх, хто мог кантактаваць з хворым. Можна сказаць, што будучы хірург увесь перыяд пандэміі знаходзіўся на пярэднім краі, выязджаў да хворых, вазіў іх на абследаванні, праводзіў, як фельчар, неабходныя маніпуляцыі. Яго самаадданая праца не засталася без увагі.

У кол-цэнтры дзіцячай бальніцы валанцёрскую дапамогу ў якасці каардынатара-дыспетчара аказваў студэнт 6-га курса педыятрычнага факультэта Алег Трач. Ён тэлефанаваў пацыентам, інфармаваў іх аб тым, што рэкамендуе ўрач. Па словах валанцёра, аб'ём работы быў даволі значны, прыходзілася вельмі хутка рэагаваць. Але перад вачыма быў прыклад медыцынскіх работнікаў, якія прыкладалі шмат намаганняў для выздараўлення пацыентаў. Гэта стала сапраўдным арыенцірам адданасці сваёй прафесіі для будучага ўрача, які таксама не мог застацца ўбаку ў надзвычайнай сітуацыі.

Усе студэнты працавалі і зараз працуюць на добраахвотнай аснове, па сваёй ініцыятыве. Больш за 100 чалавек знаходзіцца ў рэзервовым спісе. Гэта значыць, што пры неабходнасці дадатковай дапамогі ва ўстановах аховы здароўя яны гатовыя прыступіць да абавязкаў санітараў, фельчараў, медсёстраў, памочнікаў урачоў. Як зазначыла **рэктар ГрДМУ Алена КРОТКАВА,** універсітэт ганарыцца сваімі студэнтамі, якія зрабілі значны ўнёсак у выздараўленне людзей падчас пандэміі. Цяпер гэта амаль паўнавартасныя спецыялісты, якія набылі свой вопыт ва ўмовах надзвычайнай сітуацыі.

Як вядома, каранавірусная інфекцыя ўнесла карэктывы ў работу многіх сфер. У першую чаргу, зразумела, у сферу аховы здароўя. Для аказання медыцынскай дапамогі ў барацьбе супраць каранавіруснай інфекцыі было задзейнічана больш як 2300 урачоў, каля 4700 сярэдніх медработнікаў, паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Людміла КЕДА.** На яе думку, вельмі важна, што да практычнай медыцыны далучыліся студэнты-медыкі. Гэта стала вельмі добрай падтрымкай, асабліва ва ўмовах экстраннага перапрафілявання многіх спецыялістаў. Для барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй прайшлі перанавучанне больш за 1,5 тысячы спецыялістаў розных профіляў — хірургаў, тэрапеўтаў, неўролагаў, афтальмолагаў і іншых спецыялістаў.

Медыцынскі ўніверсітэт у гэтых складаных умовах стаў сапраўдным кансультацыйным цэнтрам. У любы час дня і ночы ўрачам-практыкам прыходзілі на дапамогу навукоўцы, прафесары, выкладчыкі. Яны выязджалі на месца для кансультацый. Каля 100 выкладчыкаў ВНУ працавалі і працягваюць працаваць з ковіднымі хворымі, у тым ліку і ў так званай «чырвонай» зоне.

— Пандэмія стала выпрабаваннем для многіх людзей, але ў першую чаргу, для работнікаў аховы здароўя. Менавіта яны аказаліся на перадавой у барацьбе за здароўе і жыццё сваіх пацыентаў. У Гродзенскай вобласці прыйшлося многае зрабіць, каб аказваць дапамогу якасна, прафесійна, на высокім узроўні, — падкрэсліла Людміла Кеда. — У пачатку пандэміі праведзена шмат мерапрыемстваў для перапрафілявання стацыянараў, лабараторных установ. Было праведзена шлюзаванне аддзяленняў, чаго не рабілася ніколі. Экстранна мадэрнізавана сістэма водазабеспячэння. Агульныя намаганні далі свой плён. Мы бачым станоўчы вынік. Сёння можна канстатаваць зніжэнне ўзроўню захваральнасці каранавіруснай інфекцыяй у рэгіёне.

Па словах Людмілы Кеды, сітуацыя з каранавірусам паляпшаецца. Працягваецца тэндэнцыя да зніжэння захваральнасці, хоць ёсць рост вострых рэспіраторных інфекцый. Між тым установы аховы здароўя вяртаюцца да свайго звычайнага рэжыму работы. На сённяшні дзень па сваім профілі працуе бальніца № 3. Сваіх профільных пацыентаў з пачатку тыдня прымаюць кардыялагічнае, гінекалагічнае аддзяленні, аддзяленне экстраннай хірургіі гарадской клінічнай бальніцы № 4. Зараз вядзецца дэзынфекцыя аддзяленняў Гродзенскай універсітэцкай клінікі, якая ў хуткім часе таксама пачне працаваць у сваім звычайным рэжыме.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# ПЛАНАВЫ РЭЖЫМ, ВАКЦЫНАЦЫЯ І ПЛР-СЕРТЫФІКАТЫ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ



**Філіял «Кардыялагічная бальніца» прымае выключна планавых хворых.**

Бальніца не закрытая для наведвальнікаў, ды і пацыенты выходзяць падыхаць свежым паветрам. Таму кантроль вядзецца строгі, каб звесці да мінімуму занос інфекцыі. Пацыенты штодзённа абследуюцца, медыкі сочаць за іх тэмпературай, цікавяцца самаадчуваннем. Робіцца бактэрыцыдная апрацоўка палат, рэгулярна праводзіцца кварцаванне, антысептыкаў і дэзсродкаў таксама хапае.

Стацыянар загружаны цалкам, але, як заўважае загадчык філіяла, так было заўсёды, бо сардэчныя хваробы сёння ў лідарах. Ён спадзяецца, што трэцяй хвалі каранавіруса не будзе і бальніца зможа займацца выключна сваімі пацыентамі. Хоць, калі спатрэбіцца, перайсці зноў у стан інфекцыйнай не будзе праблемы.

— Па амуніцыі, забяспечанасці ўсім неабходным для прыёму інфекцыйных хворых мы гатовыя, — кажа Уладзіслаў Міхайлавіч. — У рамках лячэння ковіду атрымалі дзесяць новых кіслародных канцэнтратараў. Але раю насельніцтву не расслабляцца. Масачны рэжым вельмі важны, а таксама дыстанцыяванне. Вірус яшчэ будзе муціраваць, як і ўсе астатнія. Самы таксічны быў свіны грып, захворванне працякала вельмі цяжка. Але цяпер існуе вакцына, і магчымасці з ім сустрэцца можна пазбегнуць. Калі большасць людзей будзе вакцынаваная супраць ковіду, яго пагроза таксама паменшыцца.

## ПАД КАНТРОЛЕМ

**Галоўны санітарны ўрач Магілёўскай вобласці Святлана НЯЧАЙ** запэўнівае, што захворванне на ковід мае ўстойлівую тэндэнцыю да зніжэння. І абстаноўка па Магілёўшчыне зараз нічым не адрозніваецца ад той, што склалася па краіне. У рэгіёне вядзецца планавае перапрафіляванне ўстаноў аховы здароўя і вяртанне да ранейшага рэжыму работы.

— Зараз асноўная задача — прафілактыка вострых рэспіраторных інфекцый, якія выкліка038 іншым узбуджальнікам, — кажа Святлана Нячай. — Ідзе выдзяленне парагрыпу, адэнавіруснай і рэспіраторна-сінцыцыяльнай вірусных інфекцый. І ўсе прафілактычныя мерапрыемствы, якія скіраваныя на прафілактыку ковіду, добра працуюць пры прафілактыцы рэспіраторных інфекцый. Масачны рэжым застаецца і кантралюецца і на аб'ектах транспарту, і гандлю, і ў іншых грамадскіх месцах. Гэта арганізацыя медыцынскіх фільтраў і ва ўстановах адукацыі, і на прадпрыемствах, і ў органах улады. Я ўжо не кажу пра антысептыкі, якія ў дастушнай колькасці ёсць усюды.

## ПАЧЫНАЕЦЦА ДРУГІ ЭТАП ВАКЦЫНАЦЫІ

У вобласці, як і ў іншых рэгіёнах краіны, поўным ходам ідзе прышчэпліванне расійскай вакцынай «Спадарожнік V». У першую групу ўвайшлі медыцынскія работнікі.

— На 9 лютага было прывіта больш чым 1,5 тысячы медыцынскіх работнікаў, — удакладніла Святлана Нячай. — Пабочных рэакцый, ускладненняў не зарэгістравана. Прышчапіліся і супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення аховы здароўя, і кіраўнікі санітарна-эпідэміялагічнай службы, галоўныя ўрачы Магілёва, Бабруйска, Быхава, іншых гарадоў. Я таксама прышчапілася, бо добра разумею значнасць працэдуры, як чаргавага этапу прафілактычных мер. Для таго, каб працаваць, трэба быць абароненым. А работы шмат. І нашы спецыялісты гэта разумеюць.

Зараз у вобласці амаль сфарміраваны спісы спецыялістаў сістэм адукацыі, сацыяльнай абароны, тых, хто працуе з вялікімі групамі насельніцтва ў закрытых калектывах. Па словах Святланы Нячай, прышчэпачныя пункты, якія ўтвораны на базе арганізацый аховы здароўя, ужо забяспечаны ўсім неабходным халадзільным абсталяваннем і сістэмамі кантролю тэмпературы, а медыцынскі персанал абучаны. У найбліжэйшыя дні чакаецца пастаўка наступнай партыі вакцыны, і пачнецца другі этап вакцынацыі. Трэцім этапам стане прышчэпліванне насельніцтва.

— Ужо цяпер да нас паступае шмат званкоў наконт вакцынацыі, і мы бяром гэтыя заяўкі «на аловак», — удакладняе галоўны санітарны ўрач. — Як толькі будзе магчымасць, грамадзян запросяць на вакцынацыю. Прышчапіцца можна будзе бясплатна.

Як і ў любога лекавага прэпарату ў вакцыны ёсць абмежаванні. Не прышчэпліваюць пакуль тых, каму за 60, і тых, хто перахварэў на ковід. Але вытворца нядаўна ўнёс у інструкцыю змяненні, і ў Расіі абмежаванні па ўзросце ўжо знятыя. Пытаннем аб зняцці іх у нашай краіне сёння займаецца Міністэрства аховы здароўя.

— Ці чакаць нам трэцяй хвалі? Або ўжо можна расслабляцца? — пацікавіліся мы з надзеяй у спецыяліста.

— Разумею, што ўсім надакучыла, — паспачувала Святлана Уладзіміраўна. — Але здымаць маскі пакуль рана. Цяжка сказаць, як будзе паводзіць сябе вірус. Прагнозы — справа няўдзячная. Медыкі пачынаюць рэгуляваць працэс спецыфічнай прафілактыкай. Таму цяпер спадзяванні ўскладаюцца не толькі на маскі, антысептыкі і абмежаванні. Калі фарміруецца калектыўны імунітэт, інфекцыя становіцца кіруемай. Таму і робіцца спроба, каб перавесці інфекцыю ў разрад вакцынакіруемых.

## ЗБІРАЕЦЕСЯ ЗА МЯЖУ? АТРЫМАЙЦЕ СЕРТЫФІКАТ

З панядзелка першыя цягнікі пабеглі з Беларусі ў бок Расіі. І для пасажыраў адзін білетам справа не абмяжавалася. На руках павінны быць яшчэ і сертыфікат аб праходжанні ПЛР-тэста. Гэты дакумент выдае санэпідэмслужба.

Сёння лабараторыя Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, дзе робіцца ПЛР-тэсты, працуе ў менш напружаным рэжыме. Менш чым за год практыкі работы з ковідам, тут набыты каласальны вопыт, выбудавана лагістыка даследаванняў ад забора матэрыялу да атрымання вынікаў і накіравання іх на адрас арганізацый аховы здароўя. Умацавалася і іх матэрыяльна-тэхнічная база, закуплена неабходнае абсталяванне. У распараджэнні лабараторнай службы з'явіліся аўтаматычныя станцыі пробападрыхтоўкі, што скарачае час правядзення даследаванняў. Гэта выключае чалавечы фактар і верагоднасць памылак пры правядзенні даследаванняў. Усё гэта і зніжэнне тэмпаў распаўсюджвання інфекцыі дазволіла адысці ад кругласутачнага рэжыму работы. Цяпер для насельніцтва актуальнай стала тэма выезду за мяжу і вяртанне дамоў. І ПЛР-тэст пры гэтым застаецца «залатым стандартам» дыягностыкі каранавіруснай інфекцыі.

— Наша задача як акрэдытаванай лабараторыі — забяспечыць людзям магчымасць свабоднага перамяшчэння, — кажа Святлана Нячай. — Мы адзіныя ў вобласці, хто мае акрэдытацыю і дазвол выдаваць сертыфікаты, у тым ліку на англійскай мове. І колькасць такіх даследаванняў толькі расце. Калі не браць у разлік турыстычныя кампаніі, якія перыядычна выляталюць з Магілёва і Мінска, дзесьці да 100 сертыфікатаў у суткі мы падрыхтоўваем.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Кампетэнтна

**Алена ЧАЧУРА, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Магілёўскага аблвыканкама:**

— Сітуацыя з ковідам у Магілёўскай вобласці паляпшаецца, і медыцынскія ўстановы пераходзяць на звычайны рэжым работы. Вярнуліся ў прывычны рытм анкалагічныя ўстановы Магілёва і Бабруйска, абласны шпіталь ветэранаў і філіял кардыялагічнай бальніцы, перапрафіляваны неўралагічнае, гематалагічнае і кардыялагічнае аддзяленні абласной клінічнай бальніцы. Цэнтральныя раённыя бальніцы працуюць у рэжыме змешанага стацыянара, і выдзелены ложкі пад ковід-пацыентаў. Цалкам ковіднымі пакуль застаюцца Магілёўская бальніца № 1 і частка абласной інфекцыйнай бальніцы.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **Несвижское райпо, Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Советская, 5/1. Тел. + 375 1770 2-55-67** |
| **Оператор ЭТП, адрес ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона**
**Капитальное строение, расположенное по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Гейсика, д. 1**

| Наименование (назначение) | Общая площадь, кв. м | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание овощехранилища** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 690,9 | 621/С-44852 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | Подвал, крыльцо (согласно тех. паспорту) |
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 0,0853 га. Предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания овощехранилища |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **91 200,00 белорусских рублей** |
| **Порядок ознакомления** | В рабочие дня с 08.00 по 17.00 + 375 33 364 21 45 (Марук Евгений Николаевич) |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; **нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на валютные счета, указанные на сайте организатора аукциона**: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20 (двадцать) рабочих дней** после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение размере 3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 10.00 16.03.2021** **Окончание торгов – 12.00 16.03.2021** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.00 12.03.2021 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**1. КОМПЛЕКС ОБЪЕКТОВ ЦЕХА ПО ПРОИЗВОДСТВУ КРАСНОГО КИРПИЧА по ул. Осипенко, 21, 21/1 – 21/3, 21/8, 21/11 – 21/14 в г. Волковыске**

Начальная цена предмета аукциона – 29 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится **25.02.2021 г. в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **19.02.2021 г. до 16.00.**
Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.
в городе Гродно 8 (0152) 62 39 11, 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31
Дополнительная информация размещена на сайте: https://au.nca.by

УНП 500042135

## ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ КРЕДИТОРОВ ООО «ТРАЙПЛ»

**по вопросу защиты требований ЗАО Банк ВТБ состоится 24.02.2021 в 13.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, дом 51, корп. 2, 1-й этаж.**

Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу: г. Минск, ул. Декабристов, д. 5, пом. 1, эт. 2, офис 15, предварительно согласовав время с управляющим по тел. +37517342-18-18.

Также более подробная информация опубликована в объявлении на сайте: **http://bankrot.gov.by**.

УНП 100017108

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Ликвидатор открытого акционерного общества «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз»**
**(Продавец, организатор торгов)**
***проводит повторные торги в форме открытого аукциона***
**ПО ПРОДАЖЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОГО НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, расположенного по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Р. Ибаррури, 42:**

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 610/С-28498 расположено по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 42, площадью 1922,0 кв. м, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад готовой продукции. Расположено на земельном участке площадью 0,1578 га с кадастровым номером 620850100001003049 (право аренды).
Обременения: ипотека.
Начальная цена – 56 740,00 бел. рублей без учета НДС.

**Лот № 2:** капитальное строение с инвентарным номером 610/С-28481 расположено по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 42, площадью 1450,6 кв. м, целевое назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – производственное здание. Составные части и принадлежности – одноэтажное смешанной конструкции производственное здание с подвалом, пристройка, навес, крыльцо, сход в подвал, приямки. Расположено на земельном участке площадью 3,1895 га с кадастровым номером 640400000001000913 (право постоянного пользования). На указанном земельном участке расположены иные капитальные строения.
Обременения: ипотека.
Начальная цена – 45 180,00 бел. рублей без учета НДС.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах:

Заявления на участие и необходимые документы в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 принимаются по 18.02.2021 включительно в рабочие дни с 10.00 до 15.00 по адресу: 246017, г. Гомель, ул. Красноармейская, д. 7.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены (шаг 5 %). Торги проводит ликвидатор. В процессе торгов начальная цена повышается до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. **К указанной цене добавляется НДС**. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество.

Задаток в размере 0,01 % от стоимости лота перечисляется на расчетный счет Продавца: BY98ALFA30122095570070270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, БИК ALFABY2X.

По результатам проведения торгов оформляется протокол. С победителем торгов в срок не позднее 10 рабочих дней заключается договор.

Оплата приобретенного предмета торгов **с учетом НДС** осуществляется в срок до 20.04.2021.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Ранее опубликованные объявления:
газета «Звязда» за 08.10.2020; газета «Звязда» за 18.11.2020;
газета «Звязда» за 22.12.2020; газета «Звязда» за 19.01.2021.

**Аукцион состоится 22.02.2021 в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, д. 7.**

Осмотр имущества осуществляется по месту нахождения имущества по предварительной договоренности по тел. +375296555051.

## ОАО «Амкодор-КЭЗ»

***Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3.***

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО (ГОДОВОГО) ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

**Собрание состоится 31 марта 2021 г. в 14.00 по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества**

Орган, созывающий собрание:
Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ».
Регистрация участников собрания производится
в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.55.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2020 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2021 год.
2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2020 год.
3. Об утверждении распределения и использования прибыли (убытков) за 2020 год.
4. Утверждение направлений распределения прибыли общества на 2021 год.
5. Об избрании членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.
6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период начиная с 10 марта 2021 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 23 марта 2021 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-КЭЗ» (Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

**Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ»**

УНП 300028841

Паехалі!

# МАГІСТРАЛЬ ВЫПРАБОЎВАЕ НОВЫ ЦЯГНІК

**Беларуская чыгунка сумесна з кампаніяй «Штадлер Мінск» прыступіла да доследных выпрабаванняў першага пяцівагоннага электрацягніка міжрэгіянальных ліній бізнес-класа.**

Кантракт на пастаўку дзесяці сучасных электрацягнікоў паміж Беларускай чыгункай і кампаніяй ЗАТ «Штадлер Мінск» быў падпісаны ў студзені 2019 года. Першыя тры паступяць у трэцім квартале гэтага года. Іх плануецца эксплуатаваць на найбольш запатрабаваных у пасажыраў электрыфікаваных участках Беларускай чыгункі.

Для падрыхтоўкі да арганізацыі рэгулярнага руху новых электрацягнікоў з пасажырамі магістралі неабходна правесці шэраг выпрабаванняў. Доследны прабег электрацягніка складзе не менш як 5000 кіламетраў.

Базавай мадэллю для распрацоўкі новых пяцівагонных электрацягнікоў сталі сямівагонныя электрацягнікі серыі ЭПМ, якія паспяхова курсіруюць па Беларускай чыгунцы са жніўня 2016 года па маршруце Мінск — Гомель.

Максімальная хуткасць новых электрацягнікоў складае 160 кіламетраў у гадзіну. У іх прадугледжана 262 месцы для сядзення, першага і другога класаў. У зоне першага класа (павышанай камфортнасці) размешчана 16 месцаў. Тут устаноўлены камфартабельныя крэслы са спінкай, што рэгулюецца па вугле нахілу, ёсць індывідуальныя падлакотнікі. Зона першага класа аддзелена шкляной перагародкай з электрычным прыводам. Таксама ў пасажырскім салоне гэтага класа ўстаноўлены кнопкі выкліку праваднiка, пры націсканні на якія ў купэ апошняга выдаецца аўдыявідэасігнал. Абсталяваны месцы для размяшчэння буйнагабарытнага багажу, гардэроб для верхняга адзення. У салонах другога класа ўстаноўлены мяккія сядзенні з падлакотнікамі па сістэме «3+2».



Вокны ў новых цягніках аснашчаны сонцаахоўнымі рулоннымі шторамі з фіксацыяй іх у любым зададзеным становішчы. У цягніку прадугледжана наяўнасць трох туалетных комплексаў, абсталяваных аварыйнай кнопкай выкліку персаналу, адзін з якіх — для асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Ва ўсіх вагонах інфармацыя пра нумары вагонаў і месцы, а таксама інфармацыя, якая размяшчаецца на элементах кіравання для пасажыраў, прадубляваная шрыфтам Брайля. У адным з салонаў электрацягніка прадугледжаны зоны для перавозкі дзіцячых калясак, буйнагабарытнага багажу або перавозкі трох веласіпедаў.

Ва ўмовах павышанай увагі да дэзінфекцыі рухомага саставу пяцівагонныя электрацягнікі абсталяваны кандыцыянерамі з інтэграваным унутрыбактэрыцыдным модулем апрацоўкі рэцыркулюемага паветра. Акрамя таго, электрацягнікі абсталяваны сістэмай бесправаднога доступу да сеткі Інтэрнэт (Wi-Fi), а таксама сістэмай узмацнення сігналу GSM.

Сёння на Беларускай чыгунцы эксплуатуецца 18 сучасных электрацягнікоў вытворчасці швейцарскай кампаніі, якія курсіруюць па маршрутах гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній бізнес-класа. Яны заваявалі папулярнасць і заслужана карыстаюцца высокім попытам у пасажыраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ИНФОРМАЦИЯ О ФОРМИРОВАНИИ РЕЕСТРА АКЦИОНЕРОВ

**ОАО «Амкодор-КЭЗ», Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3,**
*на основании решения Совета директоров общества от 9 февраля 2021 года для проведения очередного (годового) общего собрания акционеров*
**определило дату формирования реестра акционеров – 1 марта 2021 года.**

УНП 300028841

В объявлении о реализации дебиторской задолженности ООО «Иммо-рент», опубликованном в номере газеты «Звязда» от 05.02.2021 (стр. 22), была допущена ошибка в части даты приема заявок и проведения торгов (ошибочно указана дата 02.03.2021). Прием заявок на участие в торгах осуществляется до 09.03.2021. Дата проведения аукционных торгов – 10.03.2021 в 12.00. Справки по тел.: 8017 2040494, 8044 7945248.

УНП 191759752

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

11 ЛЮТАГА 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15902)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

## Мікіта БЕРАСНЕЎ:

# «ДЗЯКУЮЧЫ LIKEE Я НІБЫ АПЫНУЎСЯ Ў ІНШЫМ СВЕЦЕ»



**Час не стаіць на месцы. Здаецца, яшчэ зусім нядаўна галоўнай сацыяльнай сеткай сярод моладзі і падлеткаў з'яўлялася «УКантакце», крыху пазней на змену ёй прыйшоў Instagram, але спадабаўся далёка не ўсім. З-за чаго многія «блукалі» па прасторах інтэрнэту ў пошуках цікавага і актуальнага для іх узроставай катэгорыі кантэнту. Сёння адной з самых папулярных сацыяльных сетак сярод моладзі не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце з'яўляецца Likee. Мы пагаварылі з арганізатарам маштабнай вечарынкі Likee Party ў Мінску, а таксама памочнікам усіх «лайкераў» у Беларусі Мікітам Берасневым і высветлілі, з-за чаго ж вакол гэтай сеткі столькі хайпу.**

***— Як ты пазнаёміўся з Likee?***

— Першы раз натрапіў на яе ў 2018 годзе, тады яна толькі пачала развівацца, і я зусім не разумеў, што і як там уладкавана, напрыклад, як загружаць і адзначаць пасты. Але мяне адразу ж зачапіла сутнасць — запісванне розных відэаролікаў і скетчаў, дзе людзі або танцуюць, або спяваюць, або проста ствараюць забаўляльны прадукт для добрага настрою. Таму стаў здымаць іх са сваёй сяброўкай Вікторыяй Зайцавай, але публікаваў зробленае ў Instagram. Праз нейкі час мне напісала адміністрацыя Likee і прапанавала здымаць для іх відэа і весці трансляцыі, рабіць гэта трэба было трыццаць гадзін у тыдзень.

***— Ці складана было набраць падпісчыкаў?***

— Рабіць кантэнт для гэтага дадатку пачаў у студзені 2019 года, а ўжо бліжэй да мая ў мяне было трыццаць-сорак тысяч падпісчыкаў, і тады ў першы раз мне прапанавалі зладзіць іх збор у Мінску. Вядома ж, было вельмі прыемна, я разумеў, што ёсць людзі, якія сочаць за маёй творчасцю... Але каб прыйшла хоць малая частка падпісчыкаў, не асабліва верыў у тое, ды вырашыў рызыкнуць. У арганізацыі мерапрыемства мне дапамагала Вікторыя, і мы знялі пляцоўку на восемдзясят чалавек, а ў выніку прыйшло чалавек трыста-чатырыста. Я быў вельмі здзіўлены, і мне нават давялося крыху перарабляць сцэнарый з-за такой колькасці гледачоў. Пасля гэтай сустрэчы я арганізоўваў зборы з падпісчыкамі ў Бабруйску, Светлагорску, Санкт-Пецярбургу і яшчэ раз у Мінску, дзе зноў пралічыўся з залай. Абапіраючыся на папярэдні вопыт, зняў пляцоўку на восемсот чалавек, а прыйшло прыкладна дзве з паловай тысячы. Добра, што мерапрыемства прадугледжвала розныя актыўнасці, з-за чаго госці не тоўпіліся ў адным месцы. І менавіта пасля гэтага мерапрыемства я вырашыў для сябе, што дадзеная сацыяльная сетка сапраўды важная для людзей і я хачу ў ёй развівацца.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Важная справа*

# ТРЫМАЦЬ РУКУ НА ПУЛЬСЕ

## Як прафсаюзу не страціць сваю актуальнасць для новага пакалення?

**У год святкавання стагоддзя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі менавіта ад моладзі — творчай, актыўнай, крэатыўнай — чакаюць цікавых ідэй і прапаноў, каб маладзёжныя праекты і галіновага прафсаюза, і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі маглі выйсці на якасна новы ўзровень. Такую думку выказала старшыня Цэнтральнага камітэта прафсаюза Таццяна ЯКУБОВІЧ, якая ўзяла ўдзел у пасяджэнні Маладзёжнага савета Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.**

### ІНІЦЫЯТЫВА ЗНІЗУ




Менавіта таму сёлета плануецца запусціць конкурс на «Найлепшы маладзёжны праект пярвічных прафсаюзных арганізацый студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі». Для старшых калег — гэта выдатная магчымасць сарыентавацца і перайначыць формы і кірункі работы з сучаснай моладдзю, а потым пашырыць новы досвед на ўсіх. На дадзены момант мяркуецца абраць для фінансавай падтрымкі тры самыя цікавыя праекты, але калі на конкурс будуць пададзены настолькі якасна прапрацаваныя ідэі, што трэба будзе падтрымаць, напрыклад, не тры, а пяць, то ў ЦК прафсаюза гатовыя пайсці на гэта.

— Галоўнае — ініцыятыва павінна ісці не зверху, а знізу, — падкрэслівае Таццяна Якубовіч. — Паверце, што рэктары ВНУ гатовыя вас пачуць і вам дапамагаць. І калі вы зробіце насамрэч круты праект і мы выдзелім на яго сродкі, плюс Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі знойдзе магчымасць для фінансавання, то і рэктар не зможа вас не падтрымаць. Тым больш што ён — таксама член галіновага прафсаюза.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*Не вучобай адзінай*

# Сувязнае звяно,

## або Расказвае і паказвае медыяцэнтр БНТУ

**З чаго складаецца студэнцкае жыццё? З актыўных будняў, цікавых знаёмстваў, суполак па інтарэсах, а ў кагосьці — яшчэ і з першага рабочага месца. У некаторых студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта ёсць тое, што робіць іх шчаслівымі і аб'ядноўвае, — гэта работа ў медыяцэнтры сваёй альма-матэр, а таксама на навінавым сайце Times BNTU. Партал і інфармацыйная пляцоўка функцыянуюць у звязцы. Іх гісторыя пачалася тры гады таму, і за гэты час яны заваявалі давер з боку студэнтаў, выкладчыкаў і іншых інтэрнэт-карыстальнікаў.**

Для медыяцэнтра на тэрыторыі галоўнага корпуса БНТУ выдзелена асобнае памяшканне. Тут адчуваецца прыемная рабочая атмасфера: у кожнага работніка свая зона, дзе ён працуе над новым матэрыялам, ствараючы інфаграфіку, апрацоўвае фота або адказвае на ўваходныя званкі. Адным словам, работа кіпіць. **Галоўны рэдактар Times BNTU, а таксама супрацоўніца медыяцэнтра з 2018 года, студэнтка пятага курса машынабудаўнічага факультэта Дзіяна ЗАВАЦКАЯ** ўвяла нас у курс справы.

— Наш партал — гэта сучасная пляцоўка для студэнтаў, работнікаў, выпускнікоў і абітурыентаў універсітэта, задача якой — данесці да іх самую актуальную інфармацыю. Мы з камандай імкнёмся дапамагаць усім, каб яны бралі актыўны ўдзел у жыцці альма-матэр, дзяліліся сваімі думкамі з нагоды таго, што трэба палепшыць, як зрабіць жыццё ў яе сценах цікавейшым, даведацца, што задавальняе або не.




*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

# ТРЫМАЦЬ РУКУ НА ПУЛЬСЕ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Мы вучымся ў вас, а вы — у нас. Не бойцеся быць актыўнымі і агучваць праблемы. Улічваючы што ў Маладзёжны савет уваходзяць прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны і ўсіх ступеняў адукацыі, ён стаў выдатнай дыялогавай пляцоўкай, дзе можна абмяркоўваць хвалюючыя і для студэнцкай моладзі, і для маладых спецыялістаў пытанні. Калі ёсць праблема — мы яе вырашаем разам і разам рухаемся наперад. І ў нас ужо ёсць шмат прыкладаў, калі «вузкія моманты» вырашаліся на карысць членаў нашага прафсаюза.

Так, было шмат скаргаў на тое, што стандарт прафбюджэту для пярвічных прафсаюзных арганізацый студэнтаў ВНУ — невыканальны. Нам удалося пераканаць Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі пераглядзець падыходы. І з 1 студзеня бягучага года прафсаюзныя «пярвічкі» студэнтаў ВНУ могуць самастойна распараджацца сродкамі ад членскіх узносаў, без уліку нарматываў. І калі ім трэба больш сродкаў накіраваць на матэрыяльнае заахвочванне ці матэрыяльную дапамогу студэнтам, яны могуць скараціць свае выдаткі, напрыклад, на арганізацыю турыстычнай дзейнасці, ці зрабіць наадварот — у залежнасці ад прыярытэтаў.

**«Ніводнае пытанне, якое датычыцца студэнтаў, не вырашаецца без уліку меркавання студэнцкага прафкама».**

Яшчэ адно важнае дасягненне — 30 кастрычніка 2020 года былі ўнесены змяненні ў Палажэнне аб парадку фарміравання пазабюджэтных сродкаў і іх выкарыстанні. Цяпер грошы, заробленыя ўстановай адукацыі, можна выкарыстоўваць для заахвочвання поспехаў усіх навучэнцаў і студэнтаў (і «бюджэтнікаў», і «платнікаў»), якія дабіліся высокіх паказчыкаў у навуцы, спорце, грамадскай рабоце, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці. Можна таксама накіроўваць пазабюджэтныя сродкі для аказання матэрыяльнай дапамогі студэнтам, якія маюць у гэтым патрэбу. Раней палажэнне распаўсюджвалася толькі на студэнтаў, што навучаліся на бюджэтнай аснове, а магчымасць прэміравання студэнтаў і навучэнцаў, якія атрымлівалі адукацыю на платнай аснове, не прадугледжвалася.

Нядаўна ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу паступіў абноўлены Кодэкс аб адукацыі. Галіновы прафсаюз плануе арганізаваць дыялогавыя пляцоўкі ў Мінску і ва ўсіх рэгіёнах, каб прапрацаваць асобна кожны ўзровень адукацыі (ад дашкольнай да паслявузаўскай, асобна — інклюзію ў адукацыі) і выказаць сваё меркаванне наконт праекта лёсавызначальнага для ўсіх дакумента.



www.ps.bnty.by

## АРГАНІЗАЦЫЮ ПАВІННЫ БАЧЫЦЬ!

— Мы — самая буйная арганізацыя ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, якая налічвае каля 600 тысяч членаў і 7 тысяч пярвічных арганізацый, — падкрэслівае **загадчык аддзела арганізацыйнай работы апарату ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аксана ВАСІЛЕВІЧ.** — Да 2020 года ў нас былі вельмі высокія лічбы ахопу членствам у прафсаюзе: 97 працэнтаў сярод тых, хто працуе, і 95,6 працэнта — сярод студэнцкай моладзі. Прафсаюз адукацыі фактычна суправаджае студэнцкую моладзь з моманту яе паступлення ва ўніверсітэт і да атрымання першага рабочага месца. А педагогі застаюцца пад нашым крылом і далей. Моладзі прысвечаны цэлы раздзел у пагадненні паміж Міністэрствам адукацыі і галіновым прафсаюзам. Ён, як скарбонка, папаўняецца штогод усё новымі і новымі нормамі.

Але мінулы год паказаў, што ў дарослае жыццё ўступае пакаленне, якое мае іншы пункт погляду, і працаваць нам стала нашмат больш складана. Таму сёння мы павінны казаць аб новых метадах, новых падыходах і ўвогуле аб новай матывацыі далучэння да прафсаюзнага руху. Але самае галоўнае — павінны расказваць моладзі, хто мы такія і чым займаемся. А наведваючы і студэнцкія «пярвічкі», і «пярвічкі» ва ўстановах адукацыі, дзе ёсць маладыя спецыялісты, мы сутыкаемся з тым, што пра нашу дзейнасць ці ўвогуле не ведаюць, ці ведаюць зусім няшмат. Таму нам трэба пераходзіць ад калектыўнай да індывідуальнай работы і знайсці ключык да кожнага: і да студэнта-першакурсніка, і да маладога спецыяліста. Мы не можам завяршыць сваю работу на стадыі «Прывітанне, першакурснік», а павінны дастукацца да ўсіх, каб малады чалавек убачыў, што ён страчвае, калі не будзе членам нашай арганізацыі. Папулярызацыя дзейнасці прафсаюза павінна адбывацца ў інфармацыйнай прасторы па ўсіх кірунках. Між іншым, падчас нашых зносін з моладдзю мы даведаліся: для іх з'яўляецца адкрыццём той факт, што ўсе сто працэнтаў членскіх узносаў, якія збірае навучэнская моладзь, застаюцца ў «пярвічках» установаў адукацыі. Гэта значыць, што студэнцкая прафсаюзная арганізацыя працуе толькі на тых, хто з'яўляецца яе членам.

Студэнцкі прафсаюз дзейнічае ў інтарэсах студэнтаў і мае магчымасць гаварыць на роўных правах як з імі, так і з кіраўніцтвам універсітэта. А яго правы і паўнамоцтвы нарматыўна ўрэгуляваныя ў пагадненнях з установамі адукацыі.

Фактычна ніводнае пытанне, якое датычыцца студэнтаў, не вырашаецца без уліку меркавання студэнцкага прафкама. Яго прадстаўнікі ўваходзяць ва ўсе ўніверсітэцкія камісіі, дзейнасць якіх закранае пытанні арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і стыпендыяльнага забеспячэння, сацыяльныя і жыллёва-бытавыя пытанні. Маніторыцца работа пунктаў грамадскага харчавання, умовы пражывання студэнтаў. Прафкам удзельнічае ў распрацоўцы правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах, палажэнняў аб засяленні студэнтаў у інтэрнаты, у размеркаванні месцаў. Адлічэнне навучэнцаў — членаў галіновага прафсаюза ці прыцягненне іх да дысцыплінарнай адказнасці таксама не дапускаецца без узгаднення з прафкамам студэнтаў...

— Маладыя людзі яшчэ са школы добра ведаюць пра дзейнасць маладзёжных грамадскіх арганізацый, пра БРСМ, але вельмі мала ведаюць аб дзейнасці прафсаюзаў. Для маладога пакалення наша работа не зусім зразумелая, а значыць, і не зусім блізкая. Таму вельмі шмат залежыць ад таго, у якой форме ім будзе данесена карысная інфармацыя, — падкрэсліла Аксана Васілевіч. — Задача прафкамаў — змяніць уяўленне пра прафсаюз толькі як пра арганізатара вольнага часу, культурна-масавых, спартыўных мерапрыемстваў і «пастаўшчыка» навагодніх падарункаў. Трэба, каб на першае месца выйшла абарона сацыяльных і эканамічных правоў і законных інтарэсаў членаў прафсаюза. Каб кожны разумеў, што, знаходзячыся ў нашай арганізацыі, ён можа разлічваць на кансультацыю па пытаннях атрымання месца ў інтэрнаце, размеркавання і пераразмеркавання маладых спецыялістаў, размеркавання вучэбнай нагрузкі ў школе, аховы працы, атрымання матэрыяльнай дапамогі і іншых. У іх будзе магчымасць адпачываць у санаторыях ФПБ. Падтрымка студэнцкіх сем'яў і маладых педагогаў — таксама сфера дзейнасці прафсаюза. А пытанняў у маладых спецыялістаў, якія прыступаюць да работы, заўсёды ўзнікае шмат. Напрыклад, усіх без выключэння цікавіць, як фарміруецца тарыфная стаўка? Ад якіх фактараў залежыць іх заработная плата? Ці можна паўплываць на яе памер? Ці правільна ім налічваецца заробак?

«Хацелася б, каб дзейнасць Маладзёжнага савета прыўнесла нешта новае і пазітыўнае, каб былі прапанаваны канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, бо сёння кожны чацвёрты член Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі — прадстаўнік навучэнскай моладзі, — дадала Аксана Васілевіч. — Студэнцкім прафкамам трэба трымаць руку на пульсе, разумець інтарэсы студэнтаў і супастаўляць іх з магчымасцямі кіраўніцтва».

## СЛОВА — МОЛАДЗІ

**Намеснік старшыні ППА студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Міхаіл КУЗЬМЯНКОЎ** прапанаваў праводзіць студэнцкі фестываль першакурснікаў:

**«Усе сто працэнтаў членскіх узносаў, якія збірае навучэнская моладзь, застаюцца ў «пярвічках» устаноў адукацыі».**

— Гэтую ідэю падгледзеў у Санкт-Пецярбургу. Паверце, што калі 30 жніўня пройдзе такі фестываль, а 2 верасня мы прыйдзем да першакурснікаў, то нам будзе прасцей прэзентаваць сябе і знайсці з «навабранцамі» агульную мову, — падкрэсліў ён. — Агучу яшчэ дзве прапановы. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі праводзіць конкурс «Каралева Вясна», дык чаму б нам не арганізаваць пад крылом прафсаюза падобны конкурс для хлопцаў і не выбіраць з іх самага вясёлага, дасціпнага і адэкватнага?

Яшчэ адзін перспектыўны кірунак — студэнцкі спорт. Напрыклад, у ЗША ён з'яўляецца важнай прыступкай да прафесійнага. І быць членам універсітэцкай каманды — вельмі прэстыжна. А ў нас хоць і праводзяцца студэнцкія спартакіяды, але ўзровень развіцця студэнцкага спорту, цікавасці да яго — зусім іншы. У Санкт-Пецярбургу дзейнічае студэнцкая футбольная прэм'ер-ліга, дзе ўдзельнічаюць абсалютна ўсе ВНУ. Дык чаму б і нам не праводзіць такія спаборніцтвы ў абласных гарадах з рэспубліканскім фіналам у сталіцы?

**Дзіяна ТРАФІМОВІЧ, старшыня ППА студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы,** звярнула ўвагу членаў Маладзёжнага савета і ЦК прафсаюза на наступную праблему:

— Палажэнне аб парадку прадастаўлення зніжак са сфарміраванага кошту навучання было зацверджана пастановай Савета Міністраў у далёкім 2006 годзе. Згодна з ім, адной з умоў атрымання зніжкі студэнтам, якія навучаюцца на платнай аснове, з'яўляюцца высокія паказчыкі ў вучэбнай дзейнасці: гэта значыць, што па выніках папярэдняга навучальнага года ў яго павінна быць 50 працэнтаў адзнак «10» і «9» балаў, а астатнія адзнакі — не ніжэй за «6» балаў.

Я прааналізавала сітуацыю на нашай ВНУ: у 2020/2021 навучальным годзе зніжку на кошт навучання ў нас атрымалі 163 студэнты, з іх толькі адзін — не гуманітарый. Гэта значыць, што студэнты, якія навучаюцца на прыродазнаўча-навуковых і тэхнічных спецыяльнасцях, на факультэце біялогіі і экалогіі, інжынерна-будаўнічым факультэце, проста не могуць упісацца ў вызначаныя крытэрыі па балах. Калі ж узяць Інструкцыю аб парадку прызначэння стыпендый, то там ніжні парог для атрымання мінімальнай стыпендыі складае ў «негуманітарыяў» «5» балаў, а для астатніх — «6». Яно і зразумела, бо вывучаць філалогію ці псіхалогію прасцей, чым, напрыклад, прыкладную матэматыку або фізіку. Дык, можа, трэба зрабіць і палажэнне аб зніжках больш лаяльным да «негуманітарыяў»? Тым больш што многія з іх маюць высокія дасягненні ў навуковай рабоце, актыўна задзейнічаны ў грамадскім жыцці ўніверсітэта, але ўсяго адна «шасцёрка» пазбаўляе іх права прэтэндаваць на атрыманне зніжкі на кошт навучання.

Старшыня ЦК прафсаюза Таццяна Якубовіч паабяцала ўзняць гэтае пытанне на іншым узроўні. Таксама прагучала прапанова зрабіць адну магутную дысконтную праграму для ўсіх членаў прафсаюза. Цяпер такія праграмы дзейнічаюць толькі на ўзроўні асобных ВНУ. Але, як высветлілася, пакуль што гэта прапанова ўпіраецца ў неабходнасць пераходу на адзіны для ўсіх электронны прафсаюзны білет, паколькі розныя арганізацыі ў сістэме адукацыі прывязаныя да розных банкаў.

*Прастора для мэтанакіраваных*

# ІДЭЯ + КАМЕРЦЫЯЛІЗАЦЫЯ

БДУ наладжвае супрацоўніцтва з маладзёжным бізнес-інкубатарам

**Адпаведнае пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі прарэктар па навуковай рабоце БДУ Васіль Сафонаў і генеральны дырэктар бізнес-інкубатара «Маладзёжная сацыяльная служба» Алена Пліс. Дакумент пашырае магчымасці студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ ў рэалізацыі іх прадпрымальніцкіх ініцыятыў.**

На стартавым этапе ўсе бізнес-праекты БДУ праходзяць экспертную ацэнку ў Стартап-цэнтры ўніверсітэта. Тут аўтары ідэй атрымліваюць інфармацыю аб яе актуальнасці на спажывецкім рынку і падтрымку ў складанні бізнес-плана і рэгістрацыі прадукту.

Бізнес-інкубатар дазволіць паскорыць камерцыялізацыю перспектыўных ініцыятыў. На працягу трох гадоў прадпрымальнікам-пачаткоўцам будзе аказаны шэраг паслуг, які ўключае льготную арэнду офіса, юрыдычную, бухгалтарскую, кансультацыйную дапамогу ў прыцягненні інвестараў.

Таксама дакумент прадугледжвае правядзенне сумесных прэзентацый, форумаў, лекцый, канферэнцый, сустрэч з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці, рэалізацыю сумесных праектаў па падтрымцы і развіцці прадпрымальніцтва.

У БДУ надаецца вялікая ўвага развіццю прадпрымальніцкіх ідэй моладзі. З гэтай мэтай у 2019 годзе быў створаны Стартап-цэнтр, рэгулярна праводзяцца стартап-конкурсы, хакатоны і форумы: «INNSTART BSU», «Startup Heart», «HACKATHON: FROM IPT TO IPO» і іншыя. Пры падтрымцы Навукова-тэхналагічнага парка «Унітэхпрам БДУ» ўжо выраблена першая партыя інтэлектуальных упрыгожанняў, распрацаваных студэнтамі факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. На гэтым факультэце функцыянуе таксама створаны яго студэнтамі дызайнерскі праграмуемы экран «LED SquaresBoard».

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Новыя старты*

# «РОДНАЕ — НАРОДНАЕ»

**Пачатак рэспубліканскай патрыятычнай акцыі пад такой назвай быў дадзены падчас адкрытага анлайн-дыялогу БРСМ «Адзінства. Развіццё. Незалежнасць», які прайшоў напярэдадні Усебеларускага народнага сходу.**

Акцыя скіравана на папулярызацыю дзяржаўных сімвалаў Беларусі. «Сёлета БРСМ будзе рэалізаваны шэраг новых праектаў. Адзін з іх — «Роднае — народнае», у рамках якога мы таксама прапануем стварыць «Летапіс Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь». Усе перамогі і дасягненні за 26 гадоў незалежнасці адбыліся пад нашым дзяржсцягам. І мы ўжо цяпер вядзём распрацоўку электроннага рэсурсу, дзе будуць адлюстраваны асноўныя вехі і дасягненні нашай незалежнай суверэннай Беларусі. Хочацца, каб у кожнага ў доме



Фота БЕЛТА.

быў дзяржаўны сцяг. Безумоўна, кожны грамадзянін Беларусі павінен паважаць і ведаць на памяць гімн сваёй краіны. Гэта вельмі важна. Нашы дзяржаўныя сімвалы — герб, сцяг, гімн — заўсёды ў нас у сэрцы. І мы будзем актыўна папулярызаваць іх маладзёжнай сучаснай мовай», — падзяліўся **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, член Савета Рэспублікі Дзмітрый ВАРАНЮК.**

Сімвалічным стартам акцыі стала сумеснае выкананне ўдзельнікамі анлайн-дыялогу дзяржаўнага гімна і ўручэнне кожнаму дэлегату на Усебеларускі народны сход ад БРСМ Дзяржаўнага сцяга Беларусі.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*У «Чырвонкі» — юбілей!*

**Напярэдадні 100-годдзя «Чырвонай змены», якое будзе адзначацца 21 красавіка, пра яе згадваюць былыя і цяперашнія супрацоўнікі.**

# Стала іншай. Але засталася сабой

**Упершыню ў «Чырвоную змену» я прыйшла ў 1983-м, яшчэ студэнткай. (Тады мы абедзве былі вельмі маладыя — мне «крыху за 20», ёй «крыху за 60»). Трапіла, можна сказаць, амаль выпадкова — спачатку прынесла сваю «нятленку» ў «Настаўніцкую газету», дзе артыкул адразу «зарубілі» з прычыны занадта маладзёжнага стылю, параіўшы аддаць яго ў «Чырвоную змену». «Чырвонка» знаходзілася ў тым жа Доме друку на чацвёртым паверсе і была на той час адным з двух галоўных маладзёжных выданняў краіны. І як жа было страшна туды ісці...**



*Працавала ў «Чырвонай змене» з 1985 да 2002 года, да таго часу, калі «ЧЗ» была далучана да «Звязды». Спачатку карэспандэнтам, потым — загадчыкам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара. Сёння працуе першым намеснікам галоўнага рэдактара газеты «Звязда».*

У аддзеле маральна-этычных праблем (увіце, быў і такі) артыкул узялі і прапанавалі прыносіць яшчэ. І закруцілася...

Людзі ў «Чырвонцы» пры больш блізкім знаёмстве аказаліся зусім не страшныя, а, наадварот, прыязныя, дружалюбныя і інтэлігентныя. Вельмі хутка яны прынялі мяне ў сваю «кампанію», не забываючыся, аднак, паміж справамі даваць парады і накіроўваць у патрэбнае рэчышча — вельмі тактоўна і ненавязліва. Зразумела, я слухала, запамінала і старанна выконвала ўсе заданні. Ды і як было не слухаць? У газеце працавалі сапраўдныя асы маладзёжнай журналістыкі — Галіна Пшонік, Вольга Шаўко, Вера Шчэціна, Надзея Рошчына, Вячаслаў Кулік, Наталля Салук, Іван Ждановіч, Людміла Куслівая, Аляксей Тоўсцік... Усіх не пералічыш. Памятаю, як Вячаслаў Уладзіміравіч браў у рукі свой чарговы шэдэўр, выводзіў мяне на лесвічную пляцоўку, зачытваў некаторыя фразы і нават абзацы, а потым на поўным сур'ёзе казаў: «Вось гэта і ёсць геніяльнасць! Вучыся, пакуль я добры!» Галіна Барысаўна нікуды мяне не выводзіла, але часта паўтарала: «Пісаць трэба так, каб у канцы матэрыялу не сорамна было ставіць сваё прозвішча».

Вялікі калектыў «Чырвонкі» быў не проста дружны — ён быў глыбока з'яднаны адзінай мэтай, ідэяй — зрабіць наступны нумар газеты лепшым за папярэдні, прымусіць чытачоў думаць, разважаць, спрачацца, смяяцца, плакаць, закідваць рэдакцыю пісьмамі... Толькі не заставацца раўнадушнымі. Энергія бурліла і біла праз край, кожны журналіст быў літаральна апантаны жаданнем змяніць да лепшага свет — або як мінімум чыйсьці лёс. Супрацоўнікі газеты днявалі, а часам і начавалі на рабочым месцы, трымаючы з гэтай мэтай у шафе раскладушку. У камандзіроўкі ездзілі на некалькі дзён, прывозячы адтуль па чатыры-пяць «гарачых» тэм: рэпартажы з цэхаў, палёў, забояў, комплексаў, спортпляцовак, апераційных пакояў, радзільных дамоў, студгарадкоў, камсамольскіх сходаў... Ідучы раніцай у рэдакцыю, ніхто не ведаў, дзе, у якім пункце краіны скончыцца рабочы дзень. Пра ноч і ўвогуле не думалі: начаваць даводзілася ў лепшым выпадку ў гасцініцах, у горшым — у паяздах, аўтобусах, кузавах грузавых аўтамабіляў, палатках, вясковых хатах (калі добрыя людзі прыгрэюць), у залах чакання і нават на лавачках у парках. Памятаю, як аднойчы мне давялося правесці ноч на... сцэне сельскага клуба, а ў глядзельнай зале ў гэты ж час спалі на матрацах чалавек трыццаць хлопцаў — студэнтаў тагачаснага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, якія прыехалі ў падшэфны калгас дапамагаць збіраць ураджай. Прыняць іх там прынялі, а вось пра ўмовы пражывання і намнога іншае не паклапаціліся, у чым журналісты «Чырвонкі» давялося ўпэўніцца на месцы. Крытычны артыкул, які праз некалькі дзён быў надрукаваны ў газеце, атрымаўся вельмі рэзанансны, галоўнаму рэдактару давялося нават вытрымаць пэўны ціск — старшыня калгаса аказаўся чалавекам «з сувязямі»...

Час бяжыць вельмі хутка. Жыццё змяняецца — а разам з ім змяняецца і газета. «Чырвонка» цяпер ужо не тая: іншыя аб'ём, перыядычнасць, фармат... І ўсё ж, прайшоўшы праз «перабудовачныя» васьмідзясятыя, ліхія дзевяностыя і трывожныя нулявыя, яна не страціла веру ў нашу моладзь і ў тое, што ўсё абавязкова будзе добра. Сёння «Чырвонка. Чырвоная змена» — гэта пляцоўка, дзе маладыя пішуць для маладых і пра маладых. І яна заўсёды адкрытая — для людзей нераўнадушных і цікаўных, для тых, хто хоча вучыцца новаму, удасканальвацца і ўдасканальваць свет, хто любіць сваю Радзіму, культуру і мову, хто ўмее спачуваць і дапамагаць, для адкрытых, таварыскіх, няўрымслівых рамантыкаў... Для вас, сябры!

І апошняе. У «Чырвонку» мы па-ранейшаму адбіраем толькі тыя артыкулы, пад якімі аўтарам не сорамна ставіць свае прозвішчы.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# Сувязнае звяно

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У нас працуюць 27 чалавек, сярод іх як студэнты, так і выпускнікі БНУ. Працуюць чатыры журналісты, якія пішуць матэрыялы на розныя тэмы: ад асвятлення знакавых мерапрыемстваў БНТУ і інтэрв'ю з вядомымі асобамі да нататак пра тое, як правесці цікава выхадныя ці якія зніжкі прадугледжаны для студэнтаў. А таксама карэктар, два фатографы, спецыяліст па сувязях са СМІ, кантэнт-мейкеры і іншыя. Ёсць і відэастудыя з аператарам, мантажорам, рэкламна-аналітычны аддзел.

— Чым прыцягваеце падпісчыкаў? — цікаўлюся ў суразмоўніцы.

— Для таго каб ахапіць розную аўдыторыю, заўсёды шукаем новыя фарматы, напрыклад праводзім прамыя эфіры з кіраўніцтвам універсітэта ў Instagram і на YouTube-канале, ды і ўвогуле актыўна развіваем сацсеткі, каб адразу даць магчымасць зваротнай сувязі любому карыстальніку нашага сайта. Гэта вельмі важна — бачыць зацікаўленасць усіх. Напрыклад, у Instagram у нас ужо больш за 10 тысяч падпісчыкаў, у Telegram — больш за 2,5 тысячы. Хочам аддаць больш увагі і TikTok, бо, як ні круці, гэта самая хуткарослая платформа, чым абавязкова трэба карыстацца. Сочым за дзейнасцю СМІ, інфармацыйных рэсурсаў іншых універсітэтаў, розных дзіджытал-агенцтваў. Трэба разумець, якія тэндэнцыі ёсць у гэтай сферы. Цяпер у нас ёсць англійская версія сайта. Перыядычна сустракаюцца матэрыялы на роднай мове, мы толькі вітаем гэта!

Штогод сайт Times BNTU наведвае 450 тысяч карыстальнікаў, якія забяспечваюць яму два мільёны праглядаў (!). За мінулы год на партале было размешчана каля дзвюх тысяч публікацый, каманда правяла больш за 360 фотасесій і зрабіла больш за 20 тысяч здымкаў. Дарэчы, уся рэкламная прадукцыя БНТУ, якую можна бачыць ва ўніверсітэце, у метро і ў іншых месцах сталіцы, у тым ліку і брэндбук ВНУ, — гэта таксама работа медыяцэнтра. «Мы ўдзельнічалі ў распрацоўцы канцэпцыі і арганізацыі святочных мерапрыемстваў з нагоды 100-годдзя роднай альма-матэр. Увогуле, для таго каб ВНУ паспяхова развівалася, у тым ліку прысутнічала ў розных рэйтынгах, важная колькасць згадак пра БНТУ і спасылак на наш сайт у інтэрнэце, колькасць навін і іх праглядаў, падпісчыкаў у сацсетках на акаўнты ўніверсітэта», — расказала Дзіяна.

Цікава, як дзяўчына аказалася ў камандзе Times BNTU і стала яго галоўным рэдактарам?

— Некалькі гадоў таму выраша пасправаваць сябе ў журналістыцы, да таго ж вельмі хацела пачаць займацца чымсьці цікавым акрамя вучобы. Убачыла запіс ва ўніверсітэцкай групе «УКантакце» аб тым, што шукаюць аховітных у каманду Times BNTU. Прыйшла на гутарку, выканала тэставае заданне, прайшла яго і — панеслася! Хадзіла на мерапрыемствы і асвятляла іх, паралельна рэдагавала публікацыі іншых журналістаў на сайце, а таксама размяшчала навіны. Зарэкамендавала сябе як адказны і добрасумленны работнік, таму і заняла кіруючую пасаду. Гэта, дарэчы, маё першае рабочае месца. З вучобай работу сумяшчаць аказалася лёгка, большую частку апошняй можна зрабіць «на аддаленцы», патрэбны толькі ноўтбук і вольны час. Дзякуючы такой рабоце навучылася знаходзіць падыход амаль да кожнага. У жыцці я не вельмі камунікабельная, аднак у сацсетках — іншая справа.

**«Хочам аддаць больш увагі і TikTok, бо, як ні круці, гэта самая хуткарослая платформа, чым абавязкова трэба карыстацца».**

Пакуль мы размаўлялі з Дзіянай, з чарговага задання прыйшла **карэспандэнт Times BNTU — студэнтка пятага курса будаўнічага факультэта Ксенія МАЗГАВАЯ.**

— Яшчэ ў школьныя гады мне падабалася пісаць сачыненні, нават



разглядала варыянт паступлення на факультэт журналістыкі БДУ, але вучылася на фізіка-матэматычным профілі і, адпаведна, на ЦТ здавала фізіку і матэматыку. У выбары ВНУ сумненняў не было, — падала дакументы на будаўнічы факультэт БНТУ, мой дзядуля і дзядзька таксама былі звязаныя з гэтай ВНУ. На трэцім курсе адчула, што маю шмат вольнага часу, да таго ж вучоба давалася лёгка. Даведалася, што Times BNTU шукае журналістаў, і зразумела, што гэта ідэальны шанц наблізіцца да сваёй мары. Пакінула заяўку, і мне патэлефанавала Дзіяна. Вызначыліся з першай тэмай для матэрыялу, я над ім папрацавала, і ён спадабаўся рэдакцыі. Вельмі рада, што знайшла сваё першае месца работы менавіта ў медыяцэнтры. Штодзень я ў пастаянным руху, з'яўляюцца новыя знаёмыя, я даведваюся нешта новае і развіваюся ў сваёй любімай справе. Здаецца, што дагэтуль я была абсалютна іншым чалавекам. Пакуль бачу сябе менавіта ў гэтым кірунку. Такая работа змяніла мяне як асобу, я стала больш рознабаковая і ініцыятыўная. Адчуваю, як пачала хутчэй успрымаць і апрацоўваць вялікія аб'ёмы інфармацыі.

— Як і хто можа трапіць да вас у каманду? — пытаюся ў дзяўчат.

**Штогод сайт Times BNTU наведвае 450 тысяч карыстальнікаў, якія забяспечваюць яму два мільёны праглядаў (!).**

— Мы перыядычна праводзім гутаркі, размяшчаем інфармацыю аб вакансіях у нашых сацсетках. Тыя, хто вучыцца на першым і другім курсах, асабліва хочуць трапіць да нас. Калі ў студэнта ёсць пэўныя прафесійныя якасці, якія нам патрэбны, з радасцю возьмем яго на работу. Бывае, не адразу з усімі знаходзім агульную мову, але гэта нармальна. Галоўнае — імкнуцца якасна выконваць свае абавязкі і быць працавітымі, адказнымі, крэатыўнымі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена камандай Times BNTU.**

SEX=БАЛЯСЫ

# ВЫЛІТЫ МАЧА

**Матэматыка дапамагла вызначыць самага прывабнага прадстаўніка моцнай паловы чалавецтва ў свеце. («Аб'ява ў газеце: «Мужчыну прыгожага, багатага, без праблем з жыллём, без шкодных звычак, без кучы навязлівых сваякоў і дзяцей ад папярэдніх шлюбаў хочацца проста ўбачыць».) У сваёй рабоце аўтары даследавання выкарыстоўвалі прынцып залатога сячэння, паведаміла TheSun. Згодна з гэтай формулай, рысы твару англійскага акцёра Роберта Пацінсана на 92 працэнты блізкія да ідэалу. Раней гэты тытул належаў Джорджу Клуні, аднак з узростам яго знешнасць змянілася. («Падае папулярнасць састарэлых «зорак»! На канцэрт Пола Макартні ў Кітаі з цяжкасцю сабралася 245 мільёнаў чалавек».) Даследчыкі з цэнтра касметычнай і пластычнай хірургіі ў Лондане прыйшлі да такіх высноў, абапіраючыся на вынікі аналізаў рысаў твараў акцёраў пры дапамозе найноўшых камп'ютарных тэхналогій. («— Калі я з табой, мне не хочацца думаць ні аб рабоце, ні аб кар'еры... — Пятровіч, кар'ер сам сябе не выкапае! Паспрабуй яшчэ раз завесці экскаватар!») Тут тэхніка выступіла «ў суаўтарстве» з анатоміяй і генетыкай.**

А вось самым прыгожым мужчынам на планеце (ні больш, ні менш) назвалі найпапулярнейшага ў свеце (зноў жа, так пішуць) блогера Фелікса PewDiePie Чэльберга. Паводле штогадовага рэйтынгу Independent Critics, шведскі аўтар аказаўся на першым радку, абагнаўшы астатніх знакамітасцяў. («Жонка мужу: — Мне столькі грошай трэба: на дэпіляцыю, на манікюр, на педыкюр, на мелiраванне, на касметыку... Муж: — А мне пашчасціла! Я адразу прыгожым нарадзіўся».) Стваральнікі рэйтынгу адзначаюць, што спісы самых прыгожых асоб заўсёды вельмі суб'ектыўныя, таму многія могуць не пагадзіцца з вынікамі. («Вы заўважылі, што людзі, якія маюць з вамі адзін і той жа пункт погляду, нейк прыгажэйшыя за астатніх?») Нягледзячы на такую заяву, знайшлося мноства каментатараў, якія негатыўна ўспрынялі вынікі рэйтынгу. Што ж, гэта традыцыйныя хібы глядацкіх сімпатый. («Жанчына заўсёды марыць пра тое, каб побач была спагадлівая і любячая душа. Але мужчына звычайна прыходзіць увесь».)



А вось часопіс People назваў самага сексуальнага мужчыну 2020 года. Не ўсёй планеты, але ж... На гэты раз тытул быў прысуджаны 33-гадоваму акцёру Майклу Бі Джордану. Не спяшайцеся думаць, што справа выключна ў знешнасці і папулярнасці «Чорнай пантэры». Аказваецца, браліся пад увагу і чалавечыя якасці героя. Яго называюць класічным добрым хлопчыкам: ён вельмі любіць сваіх бацькоў і нават да нядаўняга часу жыў з імі. («— Першыя сорак гадоў самыя цяжкія ў жыцці любога хлопчыка».) Нават на цырымонію «Оскара» пазалетась прыйшоў з маці. («— Сынок, калі ты ўжо знойдзеш сабе жыллё і будзеш жыць асобна ад нас? — Ну мам, давайце я хоць бы школу скончу!») Яшчэ Майкл умее камунікаваць са сваімі фанатамі. («Муж жонцы: — А ты змагла б пераспаць з Джоні Дэпам за мільён долараў? — Канешне! Толькі дзе ж я гэты мільён знайду?») Акцёр прызнаецца, што вельмі любіць паесці, напісаўшы ў «Інстаграме», што «ежа — гэта яго мова кахання». Свой ідэальны вечар ён апісвае прыкладна як «сядзець на канапе з вялікай талеркай рознага фаст-фуду і глядзець любімыя анімэ». Зноў жа, умее чароўна ўсміхацца. Карацей, ну чым не свой хлопец? («Кароткі пераказ з сацсеткаў фільма «Масква слязам не верыць»: — А яшчэ я храплю, п'ю, зарплата маленькая і кватэры ў мяне няма... — Як доўга я цябе чакала!»)

А калі ўсяго гэтага бракуе, але быць мача вельмі хочацца? Ёсць яшчэ касметалагічны спосаб. («Калі б я не піў, не курыў, займаўся спортам, прытрымліваўся б дыеты, своечасова клаўся спаць, не хваляваўся па дробязях, дык у свае цяперашнія 59 гадоў выглядаў бы на 58».) Пол Борг з Аўстраліі шмат гадоў змагаўся з недасканаласцю скуры. У спробах вылечыць высыпку мужчына пачаў употайкі карыстацца... касметыкай жонкі. («Па якіх параметрах жанчыны выбіраюць шампунь? Марка, эфектыўнасць, пах, склад, колер, якасць, дызайн упакоўкі, водгукі, рэклама, вядомасць. А па якіх параметрах мужчыны выбіраюць шампунь? На этыкетцы павінна быць напісана «Шампунь».) Ведаеце, чым усё скончылася? Жонка даведалася пра падзею, сужэнцы абмеркавалі праблему і прыйшлі да высновы, што на рынку сапраўды няма дзейсных прадуктаў, скіраваных на паляпшэнне якасці скуры мужчын. Пасля двух гадоў работы з вучонымі пара запусціла серыю сродкаў Skills, распрацаваную спецыяльна для прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва. («— Гэтая маска дапаможа захаваць маладосць скуры... — Пятровіч, я ведаю, я ж на зваршчыка вучыўся!»)

Але галоўнае тут — не перабраць. А то ведаеце... У Бразіліі лідар банды наркагандляроў Клаўвіна да Сільва, які адбываў тэрмін амаль у 74 гады, спрабаваў збегчы з турмы незвычайным спосабам: ён літаральна ператварыўся ў... 19-гадовую дзяўчыну. Адзенне і сіліконавую маску яму прынесла дачка, якую бацька планаваў пакінуць замест сябе. Пераапрануты выглядаў вельмі пераканаўча, але ўцёкі дзякуючы пільнасці ахоўнікаў усё роўна не атрымаліся. («Навошта насіць заручальныя пярсцёнкі, ва ўсякім разе мужыкам? І так цудоўна відаць, каму адзенне выбірае маці, а каму ўжо жонка».)

А вы якім спосабам карыстаецеся? («Я не стары, проста ў мяне твар вінтажны».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Дзякуючы Likee я нібы апынуўся ў іншым свеце»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— З прыходам папулярнасці не ўзнікла «зорная хвароба»?***

— Сапраўды, мяне ўжо пазнаюць на вуліцах, просяць зняць з імі відэа або зрабіць фота. Гэта, натуральна, падабаецца і нават цешыць мяне. Але пра «зорную хваробу» і слухаць не жадаю. На мой погляд, калі чалавек займаецца любімай справай, а не стварае нешта толькі для піяру, то ніколі на яе не захварэе.

***— А што наконт хейтараў?***

— Вядома, з прыходам папулярнасці разам з фанатамі і падтрымкай прыходзяць і яны. Але я выбраў для сябе тактыку, што буду аднолькава прыязны з усімі. І калі мне пішуць негатыўныя каментарый, заўсёды адказваю на яго з усмешкай і без агрэсіі, акрамя таго, паказваю, што і такі водгук важны для развіцця.

***— Як бацькі аднесліся да новай дзейнасці?***

— Нягледзячы на тое, што часта дзецям і нават падлеткам забараняюць шмат часу праводзіць у тэлефоне за праглядам забаўляльныхролікаў і тым больш іх здымаць, мае бацькі ў гэтым абсалютна мяне падтрымліваюць. Мама нават часам здымаецца ў роліках і мае ўласную старонку, а тата дапамога адбываецца за кадрам. Калі ўжо гаворка зайшла пра падтрымку, ёсць яшчэ адзін чалавек, які адыграў вялікую ролю ў маім развіцці як творчай асобы. Гэта Андрэй Траццякоў, мой дырэктар, калі б не ён, то было б вельмі складана. Андрэй вырашае вельмі многія пытанні, вядзе перамовы з арганізатарамі праектаў, мерапрыемстваў і рэкламадаўцамі, і вядома ж, аказвае вялізную псіхалагічную падтрымку.

***— Часта «лайкеры» выкарыстоўваюць паняцце «вайн», што гэта?***

— Гэта кароткаметражны ролік, які, як правіла, доўжыцца не менш за хвіліну. Часцей за ўсё яны маюць гумарыстычны характар. Іх імкнуцца зрабіць максімальна маляўнічымі, для чаго выкарыстоўваюць розныя эфекты і накладваюць «прыліпчывую» музыку ў якасці фону. Тэм для такіх відэа мноства, у гэтай справе галоўнае падабраць яе ў залежнасці ад аўдыторыі. Многія не бачаць розніцы паміж «вайнам» і звычайным відэа, але заўзяты «лайкер» размяжуе іх з першага погляду.

***— Колькі часу трэба на стварэнне аднаго відэа?***

— Падрыхтоўка патрэбнага кантэнту для дадатку — гэта працаёмісты і складаны працэс. Хоць відэа звычайна не доўжыцца больш за пяць хвілін, на яго падрыхтоўку траціцца ў разы больш. Прафесійныя «лайкеры» для здымак кароткіх «вайнаў» пад гатовы гук могуць выдаткаваць ад пяці да трыццаці хвілін. Але калі вы здымаеце штосьці цікавае па сюжэце, задумцы, ды яшчэ і ў розных лакацыях, сысці на гэта можа цэлы тыдзень, а посціць нешта новае ў сябе на старонцы трэба кожны дзень, інакш вылеціш з топа.



Разам з сяброўкай Вікторыяй Зайцавай і расійскім спеваком NILETTO.

***— Акрамя «вайнаў», які яшчэ кантэнт ты транслюеш?***

— У Likee я не толькі здымаю ролікі і вяду трансляцыі са сваімі падпісчыкамі, але з нядаўняга часу і з'яўляюся вядучым двух шоу. Першае — «Сямейныя вечарынкі» — гэта інтэрв'ю з «зорнымі» бацькамі і іх дзецьмі ці наадварот. Першапачаткова яно планавалася як адно мерапрыемства, у якім узялі ўдзел чатыры вядомыя блогеры з Youtube і іх сем'і. У рамках эфіру мы пагутарылі з гасцямі, шмат жартавалі, таксама разыгралі прызы сярод гледачоў. За дзве гадзіны трансляцыі нас паглядзела каля 400 тысяч чалавек. Вынік аказаўся такі выдатны, што мне прапанавалі праводзіць анлайн-вечарынкі на штотыднёвай аснове кожную пятніцу. На гэтым шоу я пазнаёміўся з Ільёй Собалевым і Дзянісам Касяковым. Другое называецца «Пераключаца далей няма куды». Яго сутнасць — інтэрв'ю з рознымі знакамітасцямі: у мяне ў гасцях ужо пабывалі Вітас, група «Марсэль», музычны дуэт RASA і многія іншыя. Ведаеш, раней усе гэтыя людзі мне здаваліся недасягальнымі, а дзякуючы Likee я нібыта апынуўся ў іншым свеце, і мне ён вельмі падабаецца.

***— Ёсць блогеры ў Likee, за творчасцю якіх ты сочыш?***

— Вядома, я не толькі сам здымаю, але і гляджу акаўнты іншых карыстальнікаў. Не з усімі топавымі прадстаўнікамі знаёмы асабіста, але іх творчасць, а для мяне гэта менавіта творчасць, ведаю. Вылучыць нейкіх любімчыкаў цяжкавата, бо ў кожнага свой кантэнт. Мне падабаюцца такія «лайкеры», як Насця Кош, Мерлін, у яе вельмі крутыя вобраз багіні, глядзіш яе відэа і адразу настрой падымаецца. Таксама люблю праглядаць відэа Дзіўнай, яна вельмі таленавітая дзяўчына, робіць крутыя каверы. Часам зазіраю ў акаўнт «лайкера» Ганны — гэта жанчына, якая займаецца варажбой.

***— Якімі якасцямі трэба вызначацца, каб дасягнуць вышынь у гэтай сферы?***

— Для таго каб быць добрым «лайкерам», не трэба мець нейкіх звышпрафесійных якасцяў. Адразу выкідаем з галавы думкі пра тое, што трэба ведаць, як манціраваць відэа, валодаць уменнямі пастаноўкі кадра — гэта ўсё прыйдзе з вопытам. Каб дамагчыся поспеху ў такой справе, вам спатрэбіцца хутка развіць некаторыя прыродныя якасці, а калі іх няма, то з гэтым нічога не зробіш. Першым я вылучыў бы таварыскасць. Блогеры ўвесь час павінны кантактаваць з вялікай колькасцю людзей: падпісчыкамі, спонсарамі і іншымі. Таксама чалавек, які хоча развівацца ў гэтай сферы, павінен быць цікаўны да жыцця, пастаянна развівацца, шмат чытаць і быць у курсе ўсіх трэндаў. Што датычыцца знешнасці, то тут толькі тры крытэрыі. Чалавек павінен быць яркі, запамінальны і абаяльны. Каб, убачыўшы яго адзін раз, ты запомніў тыпаж і заўсёды спыняўся ў стужцы менавіта на яго відэа.

***— Чым ты займаешся, акрамя блогерства?***

— Апроч развіцця як «лайкера», актыўна прасоўваю сябе ў якасці спевака. Сам складаю песні і спяваю іх на розных мерапрыемствах. Нават паспеў зняць некалькі кліпаў. Музыкай цікавіўся з самага дзяцінства, яна заўсёды ішла са мной па жыцці, чым бы я ні займаўся паралельна. Першай маёй песняй была «Атмасфера», да яе выпуску я рыхтаваўся дастаткова доўга і напружана, але гэта таго каштавала. Пасля яе ў мяне з'явіліся свае слухачы, якім дaспадобы тое, што я раблю. Зусім нядаўна была выпушчана новая песня сумесна з лэйблам Klever «Пацалунак пасля дзірола». Цяпер плануюцца яшчэ дзве кампазіцыі, і я думаю, што да канца года яны выйдуць. Калі мне давядзецца выбіраць — быць «лайкерам» або спеваком, то, хутчэй за ўсё, я выберу музыку, хоць у сучасным свеце для артыста сацыяльныя сеткі — самы хуткі шлях да поспеху, тым больш такія, як Likee.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 10.02.2021 г.

# СВАЕ ПІЛОТЫ І ЭЛЕКТРЫЧКА ДА КАЛІНКАВІЧ

## Якія планы ў беларускіх транспартнікаў

**Наш транспарт да новых умоў падрыхтаваўся ў поўнай меры. Пра гэта паведаміў міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА падчас выніковай калегіі ведамства. Авіяцыйная галіна і чыгуначны транспарт гатовыя забяспечыць выкананне ўсіх патрабаванняў, якія выстаўляюць міжнародныя партнёры па частцы забеспячэння бяспекі, выконваць масачны, тэмпературныя рэжымы і рабіць прышчэпкі.**



Ён адзначыў, што работа прадпрыемстваў транспартнай галіны залежыць ад мабільнасці насельніцтва, і выказаў надзею на наступнае зняцце абмежаванняў і павелічэнне колькасці паездак. Аляксей Аўраменка таксама распавёў, што з 12 лютага плануецца аднавіць авіярэйсы з Мінска ў Санкт-Пецярбург, а ў Растоў-на-Доне — з 13 лютага (па пяць рэйсаў «Белавія» і «Аэрафлота»). У міністэрстве спадзяюцца, што ў такой плоскасці нашы краіны будуць рухацца і далей, нарошчваючы аб'ёмы перавозак.

Аляксей Аўраменка адзначыў, што беспрэцэдэнтныя ўмовы работы не маглі не адбіцца на выкананні мэтавых паказчыкаў, якія ўвогуле скалалiся ніжэйшымі за ўзровень папярэдняга года.

У дадзеных абставінах Мінтрансам сумесна з прадпрыемствамі былі прыняты дадатковыя меры па захаванні працоўных калектываў, узроўню заработнай платы і фінансавай устойлівасці арганізацый. У прыватнасці, дадзеная работа была скіравана на аптымізацыю выдаткаў, вытворчых працэсаў і зніжэнне фінансавай нагрузкі.

Разам з тым, план мерапрыемстваў па дыверсіфікацыі і прыцягненні дадатковых аб'ёмаў перавозак грузаў чыгуначным транспартам дазволіў павялічыць аб'ёмы перавозак на 6,6 млн тон, забяспечыць прырост кантэйнерных перавозак у 1,4 раза, аб'ём якіх перавысіў 1 млн кантэйнераў у дваццаціфутавым эквіваленце.

З прычыны новых рэалій функцыянавання эканомікі і грамадства ключавой задачай гэтага года з'яўляецца мабілізацыя намаганняў на аднаўленне страчаных аб'ёмаў і фінансавых магчымасцяў. Для гэтага патрабуецца выпрацаваць новыя падыходы і метады ў вырашэнні пастаўленых задач, забяспечыць яксны рост прадукцыйнасці працы, скараціць непрадукцыйныя выдаткі з накіраваннем сродкаў на інвестыцыйныя мэты.

У сферы міжнародных аўтамабільных перавозак трэба будзе ўдасканаліць працэдуру выдачы дазволаў, стварыўшы дзейсны механізм іх эфектыўнага выкарыстання, а таксама працягнуць работу па магчымай адмене дазвольнай сістэмы. Неабходна на заканадаўчым узроўні вызначыць ключавыя пытанні па навядзенні парадку ў сферы перавозак пасажыраў з ухілам на лічбавізацыю.

З улікам мэтавай задачы пяцігодкі па павелічэнні долі электрыфікаваных транспартных сродкаў да 30 %, канцэптуальным кірункам работы з'яўляецца пашырэнне прымянення электробусаў.

У сферы чыгуначнага транспарту асноўным кірункам работы з'яўляецца забеспячэнне фінансавай устойлівасці БЧ, развіццё кантэйнернага сегмента грузавых перавозак, пашырэнне геаграфіі і маршрутаў руху. Акрамя таго, будзе завершаны праект па электрыфікацыі ўчасткаў Гомель — Жлобін — Асіповічы і Жлобін — Калінкавічы, працягнецца абнаўленне рухомага саставу. Што датычыцца работы пасажырскага комплексу, то ў прыярытэце павышэнне яго кліентаарыентаванасці за кошт паскарэння руху цягнікоў, укаранення новых форм рэалізацыі праязных дакументаў і іншае.

У сферы паветранага транспарту будзе праводзіцца работа над такім новым кірункам, як падрыхтоўка пілотаў на базе Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, важнай задачай з'яўляецца і развіццё рынку грузавых авіяперавозак, працягнецца абнаўленне парка грузавых і пасажырскіх паветраных суднаў.

З улікам створанай Дзяржаўнай адміністрацыі воднага транспарту, у 2021 годзе працягнецца рэфармаванне дадзенай галіны, у тым ліку падзел перавозачнай і партовай дзейнасці. Таксама завершыцца работа па ўнясенні змяненняў у Кодэкс унутранага воднага транспарту Беларусі.

У сферы дарожнай гаспадаркі будуць праводзіцца работы па рэканструкцыі Паўднёва-Заходняга абходу Магілёва, трох мастоў у рамках праекта «Рэспубліканскія масты і рэканструкцыя аўтадарогі М-3».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Энергаэфектыўнасць

# ЛІХТАРЫ Ў БЯРОЗЕ СТАЛІ РАЗУМНЫЯ:

## гараць без удзелу чалавека і адпаведна часу сутак і месцу знаходжання

**Вуліцы горада ў Брэсцкай вобласці цяпер асвятляюцца ўсю ноч, а на пешаходных пераходах лямпы гараць ярчэй. Пры гэтым грошай на электраэнергію мясцовыя ўлады сталі выдаткоўваць менш. Такое стала магчымым у выніку рэалізацыі энергаэфектыўнага праекта «Укараненне святлодыёднага асвятлення ў Бярозаўскім раёне з выкарыстаннем аўтаматызацыі і сістэмы кантролю», які быў ажыццёўлены горадам пры фінансавай падтрымцы (80 % ад сумы ў 775 тысяч еўра) Еўрапейскага саюза.**

### ВЯЛІКІЯ ДАСЯГНЕННІ МАЛЕНЬКАЙ СУПОЛКІ

Падаць заяўку на ўдзел у праекце Бяроза змагла дзякуючы ініцыятыве «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі», якую ў 2015 годзе падпісаў горад. За два гады рэалізацыі праекта памянялі 38 шафаў кіравання вулічным асвятленнем, а 2685 звычайных лямпаў замянілі новымі эфектыўнымі святлодыёднымі свяцільнікамі. Цяпер увесь горад асвятляецца толькі сучасным святлом, якое рэгулюецца сістэмай кіравання грамадскім асвятленнем — інтэлектуальнай сеткай, што забяспечвае неабходную колькасць святла там і ў той час, калі яно неабходна.

*— Дзякуючы праекту вырашылася праблема вулічнага асвятлення. Жыллёва-камунальная гаспадарка атрымала эканомію пры аплаце электраэнергіі, а перамяшчацца па вуліцах стала значна больш камфортна. Кіроўцы лепш арыентуюцца на пешаходных пераходах, а жыхары рухаюцца па цалкам асветленых вуліцах, —* пракаментаваў плюсы праекта **старшыня Бярозаўскага райвыканкама Сяргей БАРТАШ.**

Пагадненне мэраў — вялікая суполка амаль 10 тысяч гарадоў па ўсім свеце, і ў суполцы вельмі паважаюць гарады і раёны, што ставяць перад сабой такія амбіцыёзныя мэты і паспяхова дасягаюць іх, заўважыў **нацыянальны каардынатар праграмы «Пагадненне мэраў — Усход» Іван ШЧАДРАНОК:**

— Гэты праект унікальны не толькі дасягнутымі вынікамі, але і з пункту гледжання яго рэалізацыі. Гэта вопыт і прыклад іншым таго, як з дапамогай невялікай каманды можна дасягнуць глабальных вынікаў.

### ГОРАД ЗАСЫНАЕ — ЭНЕРГІЯ ПАМЯНШАЕЦЦА

Сапраўды, галоўным ініцыятарам праекта, які за два гады з дапамогай такіх жа нераўнадушных энтузіястаў здолеў стварыць заяўку і дамагчыся ажыццяўлення праекта ў раёне, стаў **Дзмітрый СЛУЦКІ, начальнік планава-эканамічнага аддзела Бярозаўскай ЖКГ.**

На рэалізацыю праекта спатрэбілася 30 месяцаў. На галоўных і другарадных вуліцах свяцільнікі падбіраліся рознай магутнасці ў залежнасці ад патрэб і масавасці людзей. Да рэалізацыі праекта магутнасць вулічнага асвятлення ў Бярозе была 1400 Мвт·г, цяпер яна складзе 648 Мвт·г. Такім чынам эканомія столькі энергіі, колькі на год патрабуецца 205 жылым дамам.

*— Яшчэ адзін станоўчы эфект новага асвятлення — выключэнне чалавечага фактару. Цяпер святло запальваецца дакладна ў час і з запраграмаванай інтэнсіўнасцю кожнага свяцільніка. Сацыяльны эфект праявіўся ў павелічэнні бяспечнасці і камфорту руху людзей, бо цяпер святло гарыць усю ноч, —* дадаў Дзмітрый Слуцкі.

Рацыянальна выкарыстоўваць святло можна з дапамогай дзіміравання — у вячэрні і начны час, калі актыўнасць гарадскога жыцця памяншаецца, інтэнсіўнасць асвятлення зніжаецца да 20 %, што дастаткова для бачнасці і разам з тым дазваляе не выкарыстоўваць дарэмна шмат энергіі. Як гэта выглядае, журналістам паказалі падчас афіцыйнага завяршэння праекта.



Вулічнае і дэкаратыўнае асвятленне каля бярозаўскага Палаца культуры.

У Бярозе па праекце закладвалася 3600 светлавых кропак. Свяцільнікі тут не толькі гараць згодна з праграмай, але і перадаюць інфармацыю пра свой стан на дыспетчарскі пункт, удакладніў **Аляксандр ЗАЯЦ, прадстаўнік кампаніі «Сувязьінвест»,** якая паставіла абсталяванне для разумнага асвятлення Бярозы. Паступова ўсё гэта будзе інтэгравацца ў сістэму «смарт-сіці»:

*— Нават калі будзе страчана сувязь з апаратарам, то свяцільнік не стане перадаваць інфармацыю на пульт і не будзе адбывацца дзіміраванне, аднак не здарыцца такое, што святло ва ўсім горадзе знікне. На самы крайні выпадак можна перавесці кіраванне асвятленнем у ручны рэжым.*

### ЭФЕКТЫЎНАГА СВЯТЛА — ПАКУЛЬ 1 %

Беларусь толькі пачынае шлях разумнага асвятлення гарадоў. З 600 тысяч святлакропак краіны толькі 25-30 % святлодыёдныя. Сучасныя праекты асвятлення, рэалізаваныя ў Бярозе, Навагрудку, Полацку і Мінску, ахопліваюць не больш як працэнт святлакропак. І гэта тая колькасць, што адпавядае сучасным патрабаванням энергаэфектыўнасці, расказаў **Іван ФІЛЮЦІЧ, кансультант па энергетычнай эфектыўнасці праекта ПРААН-ГЭФ-Мінпрыроды «Беларусь: падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі»:**

*— Сістэмы вонкавага асвятлення ўжываюць каля 2 % электраэнергіі ў краіне, што адпавядае спажыванню электрычнасці некалькіх адміністрацыйных раёнаў, таму тут існуе вялікі патэнцыял і для павышэння энергаэфектыўнасці, і для эканоміі сродкаў мясцовых бюджэтаў.*

Каб давесці сістэмы вулічнага асвятлення беларускіх гарадоў да належнага стану, па ацэнках экспертаў, неабходна мінімум 150 мільёнаў долараў. Спецыялісты распрацавалі адмысловую мадэль, якая дазваляе прыкладна пралічыць разнастайныя эфекты ад мадэрнізацыі асвятлення ў розных гарадах і разгледзелі гэта на прыкладзе Брэста, Пружан, Зэльвы, Гарадка і іншых.

Устойлівая работа святлодыёдных свяцільнікаў разлічана на дзесяць гадоў. А сярэдняя тэрміны акупляльнасці складаюць каля шасці гадоў, аднак гэта вельмі прыблізныя ацэнкі, якія адрозніваюцца ў залежнасці ад памераў горада, прычым зусім не адпаведна яго габарытам, акрэсліў кансультант.

У кожным выпадку неабходна ўлічваць свае асаблівасці, каб мець больш дакладныя лічбы, якія спатрэбяцца на абнаўленне святла, і вынікі, якія яно прынясе. А яшчэ не забывацца на змяненне тарыфаў на электраэнергію. Улічваць, ці спатрэбіцца мяняць мачты ліхтароў і кабельных ліній або толькі лямпы, абавязкова праводзіць энергааўдыт. А яшчэ думаць над выбарам абсталявання, якое можа спачатку абысціся даволі танна, аднак яго эксплуатацыя ў далейшым значна перавысіць выдаткі на яго ўкараненне і звядзе да нуля ўсю эканомію.

Папярэднія разлікі па праекце ў Бярозе паказваюць, што гадавое спажыванне энергіі тут зменшыцца на 44 % і горад зможа штогод эканоміць 313 тысяч рублёў. А колькасць выкідаў вуглякіслага газу зменшыцца на 724 тоны.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# ЧАС СЕЯЦЬ «СІНЕНЬКІЯ»

## Даведаліся, пачым самы запатрабаваны тавар лютага — насенне памідораў, перцаў і іншых культур

**У кожнага з нас свой адлік пачатку вясны — не каляндарнай, а асабістай. Хтосьці чакае цёплых дзён, каб «выгуляць» абноўкі гардэроба, хтосьці звязвае з заканчэннем «зімовай спячкі» планы і надзеі на перамены ў жыцці. А для агароднікаў вясна ўжо наступіла. У садовых цэнтрах — аншлаг. Бо цяпер у разгары сезон расады.**
**Мы пабывалі ў адным з найбуйнейшых садовых цэнтраў сталіцы, каб высветліць, што прапануе гандаль агароднікам, садаводам і кветкаводам у гэтым годзе і што тыя выбіраюць.**


Вопытныя агароднікі прыходзяць па насенне з нататнікамі ў руках.

### Дылетанты і эксперты

Кінуўшы позірк на паліцы з яркімі глянцавымі пакуначкамі (а на ўпакоўках — гародніна і ягады незямной прыгажосці!) нават мне, зусім не агародніцы, захацелася вырасціць што-небудзь такое, ад чаго Мічурын павесіўся б на агрэсце ад зайздрасці. Але гэта дылетанцкі падыход. Дасведчаныя дачнікі ведаюць: выбар і купля насення — справа вельмі важная, спантанасці і імпульсіўным пакупкам тут няма месца. А значыць, патрэбна падрыхтоўка. Агароднікі са стажам прыходзяць у аддзелы насення з нататнікамі ў руках. У нататніках — спіс пакупак, які складаецца загадзя. А перад яго складаннем былі ўважліва агледжаны пакуначкі насення, якія засталіся з мінулага года. Тыя, што падыходзяць да сяўбы — з няскончаным тэрмінам прыдатнасці, — істотна памяншаць выдаткі на куплю насення, вельмі адчувальныя для пенсіянераў. А яшчэ ў такіх нататніках — «чорны спіс» сартоў, што расчаравалі, а таксама пералік сартоў памідораў, агуркоў і перцаў, якія паказалі сябе малайцамі ва ўмовах канкрэтнага ўчастка зямлі.

— Інакш можна патраціць занадта шмат грошай і потым самому сябе дакараць за марнатраўства, — Ніна Міхайлаўна ахвотна ўступае ў гутарку і аўтарытэтна дае парады тым, хто сумняваецца. Яна агародніца са шматгадовым стажам. У яе руках пухлы нататнік: яна ведае і сарты, і фірмы вытворцаў насення.

— Вось бывае часам: набіраюць занадта шмат, а месца для такой колькасці пасадак не хапае. Ці няма магчымасці забяспечыць умовы для расліны.

Ёсць строгая чарговасць і ў высейванні насення на расаду. Чым даўжэйшы тэрмін ад першых усходаў да атрымання ўраджаю ў канкрэтнай культуры, тым раней яе варта сеяць. Усе гэтыя тэрміны ў нашых кліматычных умовах даўно ўжо вопытным шляхам устаноўлены агароднікамі. Зрэшты, мая суразмоўніца і адпаведную літаратуру чытае, і на форумах агароднікаў бывае, дарма што ёй 68 гадоў.

— Першы баклажан вы зможаце сарваць толькі праз чатыры месяцы пасля пасеву, таму іх першымі і высейваюць на расаду ў пачатку лютага. Ну, ды ў нас «сіненькія» ў сям'і не любяць, лепш больш памідораў пасаджу, — на ўкраінскі манер называе баклажаны Ніна Міхайлаўна. — Потым сеюць на расаду перац, дзесьці праз тыдзень пасля баклажанаў. Пасеў тататаў у лютым рабіць яшчэ рана, але я пасею зусім няшмат, для ранняга ўраджаю.

— Гэта што ж, перац вырастае да 120-140 см? Можа быць, гэта «супер-пупер»? — іншая пакупніца (відавочна, таксама дасведчаная дачніца) чытае апісанне сорту на пакуначку і разважае ўслых. — Гэта дзве-тры расліны перцу пасадзіш, і нармальна, ураджаю хопіць?..

Такі сорт перцаў жанчына (яна прадстаўляецца Лідзіяй Пятроўнай) яшчэ не спрабавала, але вось сарты памідораў вырошчвала многія.

— «Верачка» — цудоўныя памідоры: іх шмат з адной расліны і яны раннія. «Джэк-пот» добрыя, — раіць яна маладым пакупніцам, заўважаючы прыкметы нерашучасці: «браць — не браць?». — «Мангол карлік» — на аматара. А я чорныя шукаю. Мы ў сям'і салодкія памідоры любім. Мне патрэбна «Чорная багіня» — вялікі памідор, на 150 грамаў. Яшчэ малінавыя хачу, — жанчына апранае акуляры, узіраецца ў стракатыя шэрагі пакуначкаў. — Вось, «Малінавы цуд»! І — глядзіце, на 30 капеек таннейшы за іншыя сарты! — радуецца пенсіянерка. — А вось гэты сорт памідораў я не брала, не дапамагу, дзяўчаты...

— А такі паласаты не садзілі? — цікавіцца маладая жанчына ў Ніны Міхайлаўны.

— Не падабаецца, як вада! — адразае тая. — Вось гэтыя лепш вазьміце, яны салодзенькія. У мяне тут у нататніку ўсе правераныя сарты запісаныя.


Калі з памідорамі-агуркамі разабраліся, можна паглядзець нешта «на дэсерт».

— А яны для адкрытага грунту? — працягвае кансультавацца маладая пакупніца.

І тут меркаванні экспертаў падзяліліся.

— Лепш у цяпліцу, — лічыць Ніна.

— Лепш у адкрыты грунт, — пераконвае Лідзія. — Я ўсё на вуліцы вырошчваю, і памідоры ў тым ліку.

Дзяўчыне бліжэйшы пункт гледжання Лідзіі Пятроўны.

— Ой, добра. А то я думаю, мы ў гэтым годзе цяпліцу яшчэ не паставілі, вырасце — не вырасце...

— Не сумнявайцеся, усё садзіце на вуліцы. Адразу будзеце прыкрываць, а потым — убачыце па ходзе справы.

Пенсіянеркі рады пагаварыць — і адна з адной, і з маладымі пакупніцамі. Хоць кожную фразу Лідзія Пятроўна пачынае са слоў:

— Ой, няма калі размаўляць, дзяўчаты, але я вам скажу...

### «Дарагое задавальненне»

Пакецікі з насеннем ад розных фірмаў расстаўлены па розных стэлажах. У асартыменце айчыннае насенне, расійскае (яго больш за ўсё) і еўрапейскае (Польшча, Італія, Галандыя). Найбольшым попытам, па маіх назіраннях, карыстаюцца польскія і расійскія вытворцы. Цэны — кусаюцца. У сярэднім ад 60-90 капеек да 4-5 рублёў.

— Насенне памідораў мне падабаецца вось гэтае расійскае, — распавядае Ніна Міхайлаўна. — Але гэта ж і дарагое задавальненне! Два з паловай рублі за пакецік, а ў пакуначку — 5-10 штучак насення!

Толькі здаецца, што насенне каштуе капейкі. Але паспрабуйце купіць усё неабходнае хоць бы толькі для этапу рассады — сума атрымаецца досыць вялікая, нават калі эканоміць на спецыяльных вазончыках (многія пенсіянеры па-ранейшаму сеюць расаду ў пластыкавыя кубачкі ад смятаны). Вось і задумаешся: спрабаваць — не спрабаваць новы сорт. А раптам ён падвядзе — з насення ўзыдзе палова або траціна раслін, а ўраджай будзе як камаровы насок. Змарнуеш грошы, час і сілы...

— Я выбіраю заўсёды толькі сарты, а не гібрыды, — кажа адна з пакупніц, таксама з ліку «экспертаў». — Па-першае, гібрыды даражэйшыя. А па-другое... Так, у пакецiках са значком F1 (гібрыды) насенне дасць большы ўраджай, і гародніна будзе смачная. Але гэта калі ўсё атрымаецца. Але ж гібрыды капрызныя, ім цяжка дагадзіць. Можна і без памідораў-перцаў застацца. Сарты, наадварот, менш патрабавальныя, насенне таннейшае, ды можна з іх і сваё насенне назбіраць восенню, а не купляць на наступны год.

Каля стэлажа з яркімі глянцавымі пакункамі італьянскага і галандскага насення людзі не тоўпяцца. З аднаго боку, дорага, з другога — доследным шляхам праверана, што ў нашых умовах вырасціць распешчаных «еўрапейцаў» не кожнаму агародніку пад сілу.

— Набываючы тое ж галандскае насенне, варта ўлічваць, што Галандыя — краіна з інтэнсіўнымі тэхналогіямі вядзення сельскай гаспадаркі, — каментуе гэты момант па нашай просьбе **навуковы супрацоўнік НПЦ па плодаагародніцтве і бульбаводстве Уладзімір УСЦІНАЎ.** — Для атрымання ўраджаю такія расліны патрабуюць захавання пэўных тэхналагічных асаблівасцяў, што не заўсёды можа забяспечыць дачнік. Як правіла, гэта культуры для ахаванага грунту: суперінтэнсіўныя сарты, створаныя, каб на малой плошчы атрымаць максімальны ўраджай. Але калі тэхналогія іх вырошчвання не будзе выканана, сорт не зможа праявіць сябе.


У пачку — усяго 5-10 семечак.

Тое, што кажуць навукоўцы, дачнікі высветлілі на практыцы. Праўда, некаторыя агароднікі ўсё ж вырашаюць рызыкнуць і атрымліваюць добры ўраджай. Але для гэтага трэба быць дасведчаным «аграномам» — дарэчы, такіх сярод нашых пенсіянераў нямала.

Сярод пакупнікоў «Садовага свету» пераважаюць жанчыны. Але ёсць і прадстаўнікі моцнага полу.

**«Першы баклажан вы зможаце сарваць толькі праз чатыры месяцы пасля пасеву, таму іх першымі і высейваюць на расаду ў пачатку лютага... Потым сеюць на расаду перац, дзесьці праз тыдзень пасля баклажанаў. Пасеў таматаў у лютым рабіць яшчэ рана, але я пасею зусім няшмат, для ранняга ўраджаю».**

— Я вырошчваю расадным спосабам нават агуркі, — расказвае мужчына сярэдніх гадоў. — Летась пасеяў невялікую колькасць насення агуркоў на расаду ў якасці эксперыменту. У канцы сакавіка, як пацяплела, вынес збанкі на зашклёную лоджыю і потым перасадзіў у цяпліцу. Расадным спосабам агуркі вырошчваю для атрымання вельмі ранняга ўраджаю — ужо ў канцы мая мы елі свае агуркі. А што, у Столінскім раёне людзі пастаянна вырошчваюць агуркі праз расаду. Я падумаў: у гэтым ёсць сэнс, вазьму на ўзбраенне, хоць у мяне агарод і невялікі. Пад Столінам агуручныя цяпліцы велізарныя, абагравальныя, па некалькі сотак. І ёсць цёплыя расадніцы. Гэта памяншае выдаткі на абагрэў: адна справа — месяц ацяпляць маленькую расадніцу, іншае — той жа месяц абагравацъ вялікую цяпліцу.


У асартыменце насенне айчыннай, расійскай і еўрапейскай вытворчасці.

### «На дэсерт» і для душы

Калі з памідорамі-агуркамі, цыбуляй-сеянкай, морквай і буракамі, кабачкамі і баклажанамі разабраліся — забяспечылі харчовую бяспеку сям'і — можна паглядзець што-небудзь «на дэсерт» і для душы. У лютым сеюць на расаду суніцы і клубніцы: калі вы вырашылі завесці на прысядзібным участку бязвусыя клубніцы або вырасціць з насення новыя моцныя расліны ўпадабанага сорту. Пасееўшы іх у лютым, першыя ягады з маладых кусцікаў вы атрымаеце ўжо ў канцы ліпеня і дакладна будзеце есці вітамінны ласунак з уласнай градкі ў жніўні.

Шэрагі стэлажоў з насеннем кветак знаходзяцца за агароднінымі і дэкаратыўнымі культурамі (дэкаратыўны гарбуз, напрыклад, — неядомы, затое незвычайна прыгожы, розных формаў і афарбоўкі). «У кветках» менш людзей у цэлым і больш моладзі. Зразумела, адны жанчыны. Цяпер час для высейвання петуніі, лабеліі, дэльфініума, лаванды, віёлы, гваздзікоў, пеларгоніі.

— Пеларгонію я пасеяла ў канцы студзеня. Але асноўныя пасевы кветкавых культур ідуць цяпер, — распавядае пакупніца Таццяна.

Яна кажа, што дачны ўчастак ёй сям'і дастаўся ад бацькоў мужа, і цяпер агарода там няма, толькі газон і клумбы. Засталіся, праўда, яблыні, пасадзілі вішню і кусцікі садовых буякоў, ёсць градка з суніцамі і градка з зяленівам.

— А астатняе працэй купіць, — кажа суразмоўніца.

Ніна Міхайлаўна і Лідзія Пятроўна, напэўна б, паспрачаліся аб гэтым з Таццянай. Але, на шчасце, яны нас не чуюць.

**Дзіяна РОНІНА.**
**Фота аўтара.**

# «КАМЕННАЯ КВЕТКА» СТАНЕ ДАСТУПНАЯ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

## Стала вядома, калі Чорны замак Гальшанскі пакажа свае скарбы

**Яшчэ некалькі гадоў таму Гальшанскі замак я бачыла толькі ў руінах, якія паступова сціраліся з зямлі з-за дажджоў, вятроў, снягоў і няўрымслівых турыстаў. Цяпер гэты гістарычны аб'ект проста не пазнаць — за паваротам сціплай рэчкі Гальшанкі гасцей Гродзенскага рэгіёна сустракаюць Паўночная вежа, прыведзеныя ў парадак рэшткі сцен і візіт-цэнтр.**

**Тры гады таму тут пачаліся рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. «Каменную кветку» — менавіта так яшчэ да вайны звалі замак у Гальшанах — было вырашана захаваць і ператварыць у прывабны для турыстаў гістарычны аб'ект.**

**Калі пад'язджаеш да Гальшанскага замка, першае, што адзначаеш, гэта акуратнасць. Адчуванне, што ў маёнтка зноў з'явіўся гаспадар, які з асаблівай увагай прывёў усё ў парадак — добраўпарадкаваў тэрыторыі каля замка, стварыў інфраструктуру з вялікай аўтамабільнай стаянкай, расставіў новыя святлодыёдныя ліхтары і зладзіў дэкаратыўную падсветку ўздоўж алей.**

**Мы ўжо пісалі, што нядаўна тут адкрыўся візіт-цэнтр, але гэтым разам раскажам, чым здзівіць Паўночная вежа, якія знаходкі былі выяўлены на тэрыторыі замка і калі ўжо можна будзе цалкам акунуцца ў гісторыю адной з самых містычных мясцін Беларусі.**



### З карцін і гравюр

Гальшанскі замак — адзін з самых любімых для мастакоў. З асаблівым запалам яго малявалі Напалеон Орда, Альбрэхт Адам і Вінцэнт Дмахоўскі. Дарэчы, усе работы гэтых аўтараў можна лёгка знайсці ў адкрытым доступе.

Але на іх некаторыя часткі гістарычнага аб'екта ўжо былі разбураныя. Да нашага часу захаваліся толькі рэшткі Паўночнай вежы і Паўночна-Заходняга корпуса. Менавіта яны трапілі пад фрагментарныя рэстаўрацыйныя работы.

— Усе раскопкі, што праводзіліся на тэрыторыі Гальшанскага замка, дапамаглі нам лепш уявіць, як ён выглядаў цалкам, — расказвае **Сяргей ЖЫЛІК, метадыст Ашмянскага раённага цэнтра культуры.** — Спецыялістамі быў выяўлены ўвесь перыметр палаца, у тым ліку Паўночна-Заходні корпус. Былі знойдзены фрагменты вежы, а таксама замкавай капліцы. Цяпер, дзякуючы гэтаму, мы можам меркаваць, як ён выглядаў на самай справе.

Некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што Павел Сапега, прадстаўнік аднаго з магутных беларускіх родаў, будаваў замак на працягу ўсяго свайго жыцця. Аднак завяршыць пачатае не атрымалася, бо ўвесь час не хапала грошай, і ён памёр там жа ў 1635 годзе. Насуперак таму, што магнат у завяшчанні абавязаў захоўваць маёнтак і рэзідэнцыю суцэльна ў валоданні роду Сапегаў, да сярэдзіны XVII стагоддзя яе падзялілі, і тая пачала прыходзіць да заняпаду.

Каб захаваць аўтэнтычны выгляд Гальшанскага замка, было вырашана выканаць фрагментарнае аднаўленне і музеефікацыю руін.

### Шматузроўневая экспазіцыя

Можа падацца, што Паўночная вежа ўжо цалкам адрэстаўраваная. Аднак пакуль тут выкананы толькі вонкавыя работы: гідраізаляцыя падмурка, умацаванне кладкі сцен, іх тынкоўка, зроблена падсветка. Наперадзе ўнутранае адстройванне і афармленне экспазіцыйных памяшканняў.

Па словах суразмоўніка, усяго будуць задзейнічаны чатыры ўзроўні: падвальнае памяшканне, першы, другі і трэці паверхі. Кожны з іх па-свойму прадставіць гісторыю Гальшанскага замка.



Экспазіцыя падвальнага памяшкання стане сапраўдным скарбам для аматараў містыкі, легенд і паданняў. Літаральна скарбам, бо па задуме спецыялістаў там установяць падлогу-вітрыну, пад якой схаваюць скарбы Гальшан. Тыя самыя, што размяшчаліся ў спальных пакоях уладальнікаў замка.

Таксама гэта памяшканне напоўняць рамантызаваныя героі з твора знакамітага беларускага класіка Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Паўстануць перад турыстамі і вобразы знакамітых Белай дамы і Чорнага манаха.

Першы паверх будзе прысвечаны археалогіі. У прыватнасці, там размесцяцца ўнікальныя гістарычныя знаходкі, знойдзеныя на тэрыторыі Гальшан і Гальшанскага замка ў розныя перыяды пошукавых работ.

Другі ярус стане цікавінкай Паўночнай вежы. Яго цэнтр — прыгожы барочны камін, які адсылае нас да эпохі Сапегаў. Дапоўняць гэты антураж зандаж з унікальнай керамічнай пліткі, якая была знойдзена падчас раскопак, а таксама фрагменты падлогі ўнікальнага мура, якую можна сустрэць толькі ў гэтым магнацкім замку.

Экспазіцыя гэтага паверха раскажа радавую гісторыю мястэчка Гальшаны. Са слоў Сяргея Жыліка, у дадзеным выпадку стаяла задача паказаць пераемнасць.

— Мы паспрабуем паказаць гэтую пераемнасць у выглядзе ніткі такога непасрэднага сваяцтва, — сцвярджае гісторык, — ад Соф'і Гальшанскай (маці дынастыі Ягелонаў. — «**Зв.**») да Паўла Стэфана Сапегі. Хоць замак належаў гэтаму роду, але Сапегі з'яўляюцца пераемнікамі князёў Гальшанскіх, якія ў гэтым мястэчку першапачаткова пабудавалі гарадзішча.



На трэцім паверсе турыстам пакажуць вялікае пано, што сфарміруе ўяўленне пра тое, як замак выглядаў у розныя часы, якім яго змаглі захаваць мастакі і гісторыкі на старажытных карцінах і гравюрах. Там жа з'явяцца партрэты ўладальнікаў рэзідэнцыі.

Акрамя таго, тут установяць макет Гальшанскага палаца ў разрэзе. З яго дапамогай можна будзе ўбачыць, наколькі розныя па сваёй функцыянальнасці былі памяшкан-



ні ў крэпасці. А таксама зразумець, што гэта дасканала прадуманы будынак, дзе кожнае памяшканне мела сваю функцыю.

Важным момантам з'яўляецца той факт, што экспазіцыя, размешчаная на розных паверхах Паўночнай вежы, павінна будзе вытрымліваць пэўную тэмпературу і вільготнасць, таму яе называюць «халоднай».

— Усе экспанаты для музея ўжо выраблены, — кажа Сяргей Аляксандравіч. — Яны могуць быць выстаўлены на агляд у экспазіцыях у любы час, засталося толькі дачакацца завяршэння адстройвання.

### Адкрыць дзверы да фестывалю

Акрамя Паўночнай вежы, турысту даступнае так званае параднае памяшканне, якое з'яўляецца часткай Паўночна-Заходняга корпуса. Гісторыкі сцвярджаюць, што ва ўнутраным двары ўздоўж сцен праходзіла галерэя, па якой можна было трапіць у жылыя памяшканні. Цяпер тут часткова аднаўлены калоны і ачышчана тэрыторыя.

Ва ўсім гэтым цагляным збудаванні велізарную ролю маюць металічныя вонкавыя лесвіцы. З іх дапамогай можна трапіць ва ўнутраны двор, прайсціся па парадным пакоі і нават спусціцца ў склеп былога замка. Але самае галоўнае — лесвіцы выконваюць ролю назіральнай пляцоўкі і дазваляюць трапіць у вежу з трэцяга паверха.

Менавіта тут адкрываецца самы чароўны краявід. У падзорную трубу можна будзе ў дэталях разглядзець перыметр замка, а галоўнае — ацаніць панараму кампактных і прыгожых Гальшан і бязмежных пагорыстых прастораў Ашмяншчыны.

— У перспектыве, — рэзюмуе «наглядчык» Гальшанскага замка, — работа над Паўночна-Усходнім корпусам, рэшткі якога былі знойдзены падчас археалагічных работ. Дарэчы, на дадзены момант гэтая частка замка законсервавана грунтам. Для руін так лепш. Тым не менш пачатак супрацьаварыйных рэстаўрацыйных работ ужо пакладзены.

Сама Паўночная вежа зможа адкрыць свае дзверы ў маі, калі ў мястэчку зноў арганізуюць штогадовы фестываль «Гальшанскі замак», які ў папярэднія гады збіраў мноства гасцей не толькі з Беларусі, але і з іншых еўрапейскіх краін.

Работнікі музея спадзяюцца, што да гэтай падзеі ўсё будзе гатова.

**Аліса СКІБА, фота аўтара.**

### Даведка «Звязды»

У ролі заказчыкаў і выканаўцаў гэтага аб'екта выступае ўпраўленне капітальнага будаўніцтва пры Ашмянскім райвыканкаме.

Ва ўпраўленні культуры Гродзенскага аблвыканкама адзначылі, што будаўніцтва візіт-цэнтра было выканана за кошт бюджэтных сродкаў Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта. Астатнія работы ў Гальшанскім замку вядуцца дзякуючы фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва.

Акрамя таго, Гальшанскі замак з'яўляецца ўдзельнікам дзяржпраграмы «Культура Беларусі», разлічанай на 2016—2020 гады, і ў бягучым годзе была пададзена паўторная заяўка на дадатковае фінансаванне.

**31 марта 2021 г. в 9.30**

**по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1**

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ЗАО «Возвышенность»

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 г.
2. Утверждение отчета Наблюдательного совета за 2020 г.
3. Отчет Ревизора за 2020 г.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности, счетов прибыли и убытков, распределение прибыли и убытков Общества за 2020 г.
5. Избрание членов Наблюдательного совета на 2021 год.
6. Избрание Ревизора Общества на 2021 год.

С документами, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1 с 09.00 до 18.00 ежедневно, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней с предварительным телефонным уведомлением.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая, карточками, изготовленными из бумаги с указанием количества голосов.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании участников Общества, будет проводиться с 8 часов 40 минут до 9 часов 25 минут в день, и по месту проведения собрания. При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

*ЗАО «Возвышенность»,*
*г. Минск, пр-т Независимости, 16, ком. 1.*

УНП 100088694

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33 Тел.: +375 (17) 363-99-40** |

**Предмет аукциона: изолированные помещения**

| № лота | Наименование | Адрес | Начальная цена (без НДС), бел. руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение многофункциональное,** общ. пл. 1110,2 кв. м, инв. № 500/D-707946237 | г. Минск, ул. Матусевича, 33/1-1 | **1 132 000,00** | **56 600,00** |
| 2 | **Помещение многофункциональное,** общ. пл. 1106,4 кв. м, инв. № 500/D-707946238 | г. Минск, ул. Матусевича, 33/1-2 | **903 000,00** | **45 150,00** |
| 3 | **Помещение многофункциональное, общ. пл.** 1169,4 кв. м, инв. № 500/D-707946239 | г. Минск, ул. Матусевича, 33/1-3 | **981 000,00** | **49 050,00** |

**Ограничения/обременения:** ипотека, аренда. Подробная информация размещена на сайте www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Жуковская Татьяна Евгеньевна, контактный телефон +375 (29) 752-08-29 |

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст.ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

